


ТІБА-2022: ПАДРАБЯЗНАСЦІ ФОРУМУ 5

ЯК КІНУЦЬ КУРЫЦЬ? 13




Выдаецца з 9 жніўня 1917г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

8 ЧЭРВЕНЯ 2022 г.
СЕРАДА
№ 110 (29732)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Цяпер як ніколі важна развіваць эканамічныя ўзаемасувязі паміж дзяржавамі Еўразійскага эканамічнага саюза, у тым ліку з дапамогай інфармацыйных тэхналогій. Беларусь мае высокі патэнцыял развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, гатова да адкрытага дыялогу з усімі дзяржавамі, якія ажыццяўляюць лічбавую трансфармацыю, абмену вопытам і рэалізацыі сумесных праектаў».*

# МАЛОЧНАЯ СПРАВА



Яўген САДОЎСКІ — жыхар вёскі Салтаны Маладзечанскага раёна — знайшоў прызванне ў сялянскай гаспадарцы: на сваім падворку трымае невялікі малочны статак. А пачынаў дзевяць гадоў таму з кранальна-банальнага — дапамагаў матулі, а потым атрымаў ад яе падарунак — цялушачку. Стаў даглядаць, пасвіць, раздойваць. Ад Малышкі — так яе назвалі — утварылася ў Яўгена гаспадарка. Цяпер у статку ажно восем чорна-стракатых рагуль — Лізуха, Страказа, Мілка, Маргарытка, Рамашка, Нюша, Чарнуха, якіх ён выводзіць на пашу, поіць, доіць, а сырадой здае дзяржаве. Пабудаваў невялікую драўляную ферму, а ў будучыні плануе перайсці ад сялянскай гаспадаркі да фермерскай формы працы.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- Санэпідслужба: вада ва ўсіх зонах адпачынку прыдатная для купання.
- **Ваенна-медыцынскі інстытут БДМУ ўпершыню набірае дзяўчат на навучанне.**
- Фізасобы ў Беларусі ў маі прадалі на $16,6 млн валюты больш, чым купілі.
- **У Беларусі прыпыняць прымяненне павялічаных памераў ставак зямельнага падатку і падатку на нерухомую маёмасць.**
- Выстаўка карцін аб знакамітай радзіме Янкі Купалы адкрылася ў Вязынцы.
- **Міжнародны саюз канькабежцаў паэтапна павялічвае ўзроставы цэнз да 17 гадоў. Новыя правілы допуску набудуць моц з сезона 2024—2025 гадоў.**
- У Беларусі з пачатку года патанулі 99 чалавек.
- **Восем выпадкаў батулізму зарэгістравана з пачатку года ў Беларусі.**

Тэма

# НЕДЗІЦЯЧЫЯ ЗАБАВЫ

### Што павінны ведаць бацькі, каб іх нашчадкі не парушылі закон або самі не сталі ахвярамі злачынцаў

**Падчас летніх канікул некаторыя са школьнікаў застаюцца сам-насам. На жаль, не ўсе з іх могуць арганізаваць свой адпачынак. Гэтым карыстаюцца зламыснікі, якія ўцягваюць непаўналетніх у злачынную дзейнасць. Крадзяжы, распаўсюджванне наркотыкаў, махлярства ў інтэрнэце — акурат тыя правапарушэнні, якія апошнім часам часцей за ўсё здзяйсняюцца дзецьмі.**

## ПРАГА ЛЁГКІХ ГРОШАЙ

У перыяд летніх канікул, асабліва ў першыя тры тыдні, дзеці, адчуўшы свабоду, забываюць пра ўласную бяспеку. Не памятаюць і пра элементарныя правілы паводзін падчас наведвання вадаёмаў, лясоў, закінутых кар'ераў, будоўляў. Часам такая бесклапотнасць прыводзіць да атрымання непаўналетнімі траўмаў шматлікай ступені цяжкасці. Некаторыя дзіцячыя забавы ўвогуле заканчваюцца трагедыяй.

СТАР. 4

Асобы

# «МАГЧЫМАСЦІ БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ Ў СПРАВЕ ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ НЕАБМЕЖАВАНЫЯ»

### Інтэрв'ю з дырэктарам Мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» Рыгорам БЫСЮКОМ

**Сказаць, што з Рыгорам Бысюком за трыццаць гадоў работы ў Брэсце даводзілася камунікаваць шмат разоў, будзе правільна, але, відаць, не зусім дакладна. Лепш — пра плённае працяглае супрацоўніцтва. І калі Рыгор Рыгоравіч шмат гадоў працаваў у культуры, і пазней, напрыклад, у бытнасць сенатарам, заўсёды вызначаўся камунікабельнасцю, быў лёгкі на пад'ём. У каментарыі, здаецца, не адмовіў ніводнаму журналісту, гатовы зрабіць гэта ў любы час у любой сітуацыі. Колькі яго ведаю, не мае моды апраўдвацца занятасцю, ківаць на недахоп часу. Гэтак жа і цяпер, калі Рыгор Бысюк узначальвае знакавы для краіны аб'ект — Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой». Сёння мы таксама гаворым пра крэпасць, але размову пачынаем з работы ў Савеце Рэспублікі.**




Фота БелТА.

СТАР. 12

ISSN 1990 — 763X
22110

Звязда. Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «БОЛЬШ БУЙНОГА ПРАЕКТА Ў НАС У БЕЛАРУСІ НЕ БЫЛО»

**Прэзідэнт Беларусі на сустрэчы з выканаўчым дырэктарам кампаніі «Эмаар Пропертыз» Мухамедам Алі Аль-Абарам абмеркаваў рэалізацыю буйнога будаўнічага праекта ў Мінску «Паўночны бераг».**

«Асноўную ўвагу сёння ўдзелім нашаму праекту «Паўночны бераг» у Мінску, які вам належыць пабудаваць. Гэта найбуйнейшы праект, я думаю, больш буйнога ў нас у Беларусі не было», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Мухамед Алі Аль-Абар — адзін з уплывовых бізнесменаў Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, дарадца па эканамічных і інвестыцыйных пытаннях кіраўнікоў Абу-Дабі і Дубая, натхняльнік канцэпцыі архітэктуры сучаснага Дубая, заснавальнік і выканаўчы дырэктар кампаніі «Эмаар Пропертыз». Гэта кампанія ў лідарах у свеце сярод дэвелапераў і інвестараў у галіне будаўніцтва.

Прыватная кампанія, звязаная з бізнесменам, рэалізуе ў Мінску будаўніцтва шматфункцыянальнага комплексу «Паўночны бераг». Пад забудову інвестару аддадзена больш за тысячу гектараў у паўночнай частцы Мінска — ворныя землі і ландшафтныя тэрыторыі паміж вадасховішчамі Цнянскае і Дразды, МКАД і мяжой існуючага сядзібнага масіву ў раёне вуліцы Прыгараднай. Комплекс «Паўночны бераг» будзе ўключаць жылыя дамы, сацыяльныя аб'екты і аб'екты грамадскага прызначэння. У першую чаргу плануецца ўзвесці будынкі Міжнароднага выставачнага цэнтра.

«Я рады з вамі сустрэцца чарговы раз. Вы даўно сталі сябрам Беларусі, знаходзіцеся тут часта. Мы вітаем такую схему і сістэму вашай работы. І заўсёды гатовы вас сустракаць у Беларусі, тым больш вы прыязджаеце заўсёды з канкрэтнымі прапановамі», — выказаў словы прывітання госцю Прэзідэнт.

Акрамя будаўніцтва, абмеркавалі на сустрэчы і ўзаемадзеянне ў сферы высокіх тэхналогій.

«Канешне, будзем казаць пра супрацоўніцтва ў сферы ІТ-тэхналогій. Я ведаю, што гэтаму сектару вы ўдзяляеце вялікую ўвагу, і ведаю, што Эміраты значна прасунуліся ў гэтым плане. Я вам удзячны за арганізацыю размовы ў Эміратах, калі мы разам з вамі змаглі паслухаць вядучых спецыялістаў у сферы распрацоўкі штучнага інтэлекту», — успомніў кіраўнік краіны.

Ён дадаў, што тады зразумеў: у дадзеным кірунку Беларусі яшчэ многае трэба зрабіць, каб выйсці на той узровень, які дасягнулі ААЭ разам са спецыялістамі з розных краін свету.

«Акрамя гэтых буйных праектаў, я памятаю нашы сустрэчы і дамоўленасці, развагі наконт іншых праектаў, якія маглі б здзейсніць у Беларусі прадстаўнікі буйнога бізнесу Эміратаў. Мы гатовы вярнуцца, калі ёсць цікавасць, да гэтых праектаў у галіне сельскай гаспадаркі, харчавання. Вельмі актуальнае сёння пытанне», — прапанаваў тэму для размовы Прэзідэнт.

Мухамед Алі Аль-Абар падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за падтрымку ІТ-сектара ў Беларусі. «Тое, што вы зрабілі, сапраўды, важна для свету. Ваша ідэя пра развіццё Парка высокіх тэхналогій у свой час была толькі пачаткам, а сёння мы бачым, што ўсё светам правяць тэхналогіі», — сказаў бізнесмен.

Па яго словах, па экспарце ІТ-паслуг на душу насельніцтва Беларусь пераўзыходзіць гэты ж паказчык у параўнанні з многімі замежнымі краінамі.

«Але самае галоўнае для развіцця ІТ-сектара — людзі і якасць іх адукацыі. Гэта ў Беларусі ёсць для развіцця тэхналогій. Я вам раней не казаў, але валодаю самай вялікай кампаніяй па электронным гандлі на Блізкім Усходзе. У арабскім свеце мы імпартуем шмат тэхналогій. І ў нас быў шэраг сустрэч са спадаром Янчэўскім (Усевалад, кіраўнік ПВТ. — **«Зв.»**) у Эміратах і ў Беларусі. Мы ўбачылі, што ў платформу ў Эміратах беларуская кампанія могуць шмат укласці і павысіць дабаўленую вартасць», — расказаў прадпрымальнік.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### ❍ Каментарый у тэму

**Выканаўчы дырэктар кампаніі «Эмаар Пропертыз» Мухамед АЛІ АЛЬ-АБАР** расказаў, што абмеркаваў з Прэзідэнтам Беларусі супрацоўніцтва паміж краінамі ў сферы інфармацыйных тэхналогій.

«ІТ-бізнес ААЭ дае работу не менш чым пяці мільёнам чалавек ва ўсім рэгіёне Блізкага Усходу. Мы ведаем, наколькі прасунуты ІТ-сектар у Беларусі, і разумеем, што няма сёння бізнесу без тэхналогій. Наша жыццё і ёсць тэхналогіі. Мы прызнаём якасць і высокі ўзровень адукацыі беларускіх ІТ-спецыялістаў і гатовы рухацца наперад у гэтым кірунку», — сказаў спікер.

Паведаміў бізнесмен і пра ход будаўніцтва праекта «Паўночны бераг». Па яго словах, прыкладна праз тры месяцы пачнецца будаўніцтва Міжнароднага выставачнага цэнтра.

«Праз тры месяцы мы таксама плануем прыступіць да будаўніцтва жылога квартала. Таксама па ўказе Прэзідэнта каля Цнянскага вадасховішча спраектуем і пабудуем парк, бо бераг вельмі прыгожы, але не добраўпарадкаваны. Мы там зробім парк, усталюем сучаснае спартыўнае абсталяванне. Прыкладна праз два месяцы плануем адкрыць у Мінску цэнтр продажу. Цяпер вядзецца маштабнае праектаванне, якое займае шмат часу», — дадаў выканаўчы дырэктар кампаніі «Эмаар Пропертыз».

**Усевалад ЯНЧЭЎСКІ, дырэктар дзяржаўнай установы «Адміністрацыя Парка высокіх тэхналогій»,** расказаў журналістам пра планы супрацоўніцтва з партнёрамі з ААЭ.

«З Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі ў Парка высокіх тэхналогій пачынаецца вялікая і працяглая гісторыя супрацоўніцтва па ўсіх кірунках — інвестыцыйным, венчурным (укладанне ў стартапы і ў дзеючыя кампаніі), выхад нашых прадуктаў на новыя рынкі, ІТ-адукацыя», — акцэнтаваў Усевалад Янчэўскі.

Паводле яго слоў, створана дарожная карта ўзаемадзеяння, якая ўключае ў сябе ўсе кірункі супрацоўніцтва. Асабліва ў ёй адлюстравана партнёрства ў ІТ-адукацыі.

«Адукацыя — глеба, з якой растуць і стартапы, і кампаніі, і поспехі, і тэхналогіі. Калі няма якаснай адукацыі, астатняе бессэнсоўна. Беларусь вылзялялася якасцю матэматычнай і ІТ-адукацыі. Сёння неабходна да гэтага дадаць новыя рэчы. І тут мы таксама дамовіліся», — падкрэсліў кіраўнік ПВТ.

---

Харчовая бяспека

Выстава «Белагра» стала брэндам краіны

# ПАХ СМАЧНАЙ І ЯКАСНАЙ ЕЖЫ ДА «ВЯЛІКАГА КАМЕНЯ» ДАВЯДЗЕ

**Міжнародная спецыялізаваная выстава «Белагра-2022» праходзіць ужо не першы год у Кітайска-Беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень».**

«Дзякуючы ўзважанай палітыцы дзяржавы, на аснове развіцця сельскагаспадарчага машынабудавання, пры падтрымцы навукі, дзякуючы працавітасці беларусаў нашай краіне ўдалося забяспечыць харчовы дабрабыт. Мы сталі самадастатковай экспартна арыентаванай краінай», — сказаў **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Леанід ЗАЯЦ** падчас урачыстай цырымоніі адкрыцця.

Ён звярнуў увагу на тое, што сёння аказваецца жорсткі санкцыйны ціск з боку Захаду. «Гэта выклікае ў беларусаў і расіян рэакцыю ў адказ. Мы павінны больш актыўна кааперавацца, каб зрабіць нашы краіны яшчэ мацнейшымі і народы багацейшымі», — заявіў віцэ-прэм'ер. Гаворачы аб «Белагра», ён падкрэсліў, што выстава сапраўды стала брэндам краіны, аб'ядноўваючы вакол сябе мноства прадпрыемстваў і арганізацый. «Сёння будуць дэманстраваць інавацыі больш чым 400 айчынных і замежных кампаній. Прыбыла вялікая дэлегацыя Расіі. Прыемна адзначыць, што адлегласць не перашкода. Прыехалі дэлегацыі з Уладзівастока, Сахалінскай і Мурманскай абласцей. Мы шчыра вітаем дэлегацыі з Манголіі, Венесуэлы, Таджыкістана, Ірака, Ірана і іншых краін», — дадаў Леанід Заяц.

## У БЕЛАРУСІ І РАСІІ ВЯЛІЗНЫ ЭКАНАМІЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ

Пра гэта заявіў **пасол Беларусі ў Расіі Уладзімір СЯМАШКА**. Ён адзначыў, што на «Белагра» прадстаўлена як айчынная тэхніка, так і дружалюбных краін. «Сёння мы падводзім вынікі работы за апошнія 20 гадоў. Мы сталі атрымліваць больш збожжа, малака і мяса. Вырашылі пытанні харчовай бяспекі, а таксама забяспечылі сваю краіну сельгастэхнікай. Беларуская тэхніка паказала сваю канкурэнтаздольнасць. Але, нягледзячы на ўсе нашы поспехі, ніколі не трэба спыняцца на дасягнутым», — падкрэсліў пасол.

Нашы краіны цалкам забяспечваюць сваю харчовую бяспеку, нягледзячы на санкцыі. Пра гэта падчас выставы заявіў **дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ**.

«Летась нашы прэзідэнты падпісалі 28 саюзных праграм, частка з якіх забяспечвае ўзаемадзеянне ў аграпрамысловай сферы, а таксама паказвае ўзровень нашай канкурэнтаздольнасці. Фарміруюцца новыя вытворчыя ланцужкі, развіваецца імпартазамяшчэнне. На нашы дзяржавы аказваецца беспрэцэдэнтны ціск ад заходніх партнёраў, аднак мы цалкам забяспечваем сваю харчовую бяспеку. Гэтыя цяжкасці — новы этап па ўзаемааднosінах нашых краін», — падкрэсліў дзяржсакратар.

«Для нашых людзей «Белагра» — падзея, многія завітваюць сюды сем'ямі. Яны прыехалі сюды, каб умацаваць адносіны з беларускімі партнёрамі, паказаць сваю прадукцыю, гаварыць аб новых пагадненнях у супрацоўніцтве, а таксама пацвердзіць дружалюбны статус нашых краін. Вельмі важна памнажаць патэнцыял развіцця нашых краін», — падсумаваў Дзмітрый Мезенцаў.

## МЫ РАЗЛІЧВАЕМ НА 9 МІЛЬЁНАЎ ТОН ЗБОЖЖА

Гэтую лічбу прывёў на выставе журналістам **міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Ігар БРЫЛО**. Міністр падкрэсліў, што наша краіна сёлета будзе з прадуктамі харчавання, усе перадумовы для гэтага ёсць. «Нам удалося назапасіць мінеральных угнаенняў практычна па тэхналагічных нормах, мы цалкам забяспечаны палівам, тэхніка падрыхтавана. Ставім задачу павялічыць вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі па выніках гэтага года амаль на 5 %. Перакананы, што з гэтай задачай справімся», — сказаў Ігар Брыло.

Планы на ўраджай — 9 мільёнаў тон збожжа, каля 760 тысяч тон рапсу, каля пяці мільёнаў тон цукровых буракоў. «Па ўсіх пазіцыях ставяць дастаткова амбіцыйныя задачы», — адзначыў міністр, дадаўшы, што Беларусь пастаўляе прадукты харчавання ў больш чым сто краін.

«Мінулы год мы скончылі з рэкорднай сумай экспарту — 6,7 мільярда долараў. Гэты год нядрэнна пачалі, нягледзячы на змены лагістыкі, якія былі выкліканы вядомымі падзеямі. За чатыры месяцы экспарт ужо склаў 2,2 мільярда долараў з ростам на 11 % да ўзроўню мінулага года», — звярнуў увагу Ігар Брыло.

## РЫБЫ ХОПІЦЬ УСІМ

Першы раз наведаў наш горад і папрацаваў на выставе дырэктар досыць буйнога перапрацоўчага прадпрыемства «Ахоцкае», якое знаходзіцца на востраве Сахалін, Вячаслаў Фёдараў. Са слоў кіраўніка, у асноўным іх прадпрыемства робіць кансервы і прадае гатовыя паўфабрыкаты з атлантычнага селядца, гарбушы, салаты з марской капусты з даданнем кальмара і трубача (сахалінскі малюск). Далікатэсам з'яўляецца філе вэнджанай кеты, філе ціхаакіянскага селядца ў алеі. Дадзены пастаўшчык прапануе нам свежамарожаную рыбу (селядзец, гарбуша і кета) у любых колькасцях з гэтага рэгіёна.

У сувязі з заходнімі санкцыямі (нарвежская рыба) у нас на паліцах сталі з'яўляцца свабодныя нішы. Расійскія перапрацоўшчыкі і проста пастаўшчыкі рыбы досыць хутка сарыентаваліся і гатовыя заняць гэтыя нішы. Таму і прыехалі на выставу. Лагістыка дастаўкі прадуктаў цалкам прапрацавана і складае не больш чым два тыдні.

Акцыянернае таварыства «Ахоцкае» выпрабляе са свежай рыбы 10–12 мільёнаў бляшанак кансерваў. Гэта ж прадпрыемства з'яўляецца гандлёвым прадстаўніком буйных рыбных гаспадарак рэгіёна. Сябры з Сахаліна з нашымі буйнымі і сярэднімі гандлёвымі пунктамі гатовыя працаваць з адтэрміноўкай плацяжу або з іншымі льготнымі ўмовамі. Дырэктар прадпрыемства ўпэўнены, што з дапамогай гэтай выставы ўдасца нарасціць пастаўкі рыбы і рыбапрадуктаў у нашу краіну не ў разы, а ў сотні і тысячы разоў. У дадзенай фірмы ёсць заводы-партнёры, якія таксама зацікаўлены ў цесным супрацоўніцтве.

Акрамя таго, Вячаслаў Фёдараў адзначыў, што вострай перад ім паставіў задачу не проста прадаць рыбу, а яшчэ і закупіць у Беларусі якасныя кармы для жывёл, свежую гародніну, цвёрдыя сыры, сельскагаспадарчую і іншую тэхніку. Усё гэта прадстаўлена на выставе па даступных цэнах і прымальных умовах пастаўкі.

* * *

Аграрны форум традыцыйна збірае разам не толькі беларускіх аграрыяў і работнікаў харчовай і перапрацоўчай прамысловасці, але і іх замежных калег і партнёраў. Сёлета (7—11 чэрвеня) удзел у выставе прымаюць кампаніі з Беларусі, Кітая, Казахстана, Таджыкістана і іншых. Вялікая колькасць удзельнікаў запланавана ад Расіі — больш за 30 рэгіёнаў і 16 асобных стэндаў. Калектыўныя экспазіцыі сфарміравалі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, Міністэрства прамысловасці, Нацыянальная акадэмія навук, канцэрн «Белдзяржхарчпрам» і Белкаапсаюз.

Акрамя таго, «Белагра» стане і пляцоўкай для дзелавых перагавораў. У праграму выставы ўвайшлі B2B-сустрэчы, круглыя сталы, канферэнцыі, дэманстрацыйныя паказы і конкурсы.

**А ЯШЧЭ.** У выставе гэтым разам прымала ўдзел Міністэрства абароны нашай краіны. Музычнае суправаджэнне на выставе было пад музыку рытмаў марша ваеннага аркестра. Амаль у любым пункце парка лунаў водар палявой кашы з мясам, якую салдаты раздавалі бясплатна. Свята працягваецца да суботы ўключна, а даставяць на яго ўсіх ахвотных бясплатныя аўтобусы, што некалькі разоў на дзень адпраўляюцца ад метро «Магілёўская».

**Сяргей КУРКАЧ.**

Адным шляхам

# ДРАЙВЕР ІНАВАЦЫЙ

## Чым запомніўся форум ШАС у Шэньчжэне?



**У Шэньчжэне, што ў правінцыі Гуандун у паўднёвым Кітаі, прайшоў першы Маладзёжны навукова-тэхнічны і інавацыйны форум Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва «Інавацыі маладых — тэхналогіі будучыні». З ініцыятывай яго правядзення выступіў летась у верасні старшыня КНР Сі ЦЗІНЬПІН падчас пасяджэння Савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў ШАС у Душанбэ. Як заявіў тады кітайскі лідар, «гэта дасць магчымасць стымуляваць інавацыйную крэатыўнасць маладых людзей». Дарэчы, менавіта такім чынам усё і адбылося.**



### ЭНЕРГІЯ МАЛАДОСЦІ

Форум быў арганізаваны ў анлайн- і афлайн-фарматах. У яго рамках прайшоў шэраг паралельных форумаў, удзельнікі якіх абмеркавалі пытанні маладзёжнага інавацыйнага ўзаемадзеяння, здароўя народа, развіцця лічбавай эканомікі, штучнага інтэлекту, «зялёнага» развіцця, а таксама супрацоўніцтва па скарачэнні беднасці і развіцця сельскіх раёнаў. Адметна, што віртуальным вядучым цырымоніі адкрыцця форуму стаў робат са штучным інтэлектам.

Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва — найбуйнейшая сусветная рэгіянальная платформа ўзаемадзеяння. Цяпер яе членамі з'яўляюцца восем краін з агульным насельніцтвам больш за тры мільярды чалавек, якія фарміруюць чвэрць глабальнага ВУП. Чатыры дзяржавы (сярод іх — Беларусь) маюць статус наглядальнікаў, яшчэ шэсць з'яўляюцца партнёрамі па дыялогу.



Моладзь — нястомны рухавік інавацый, якія з'яўляюцца драйверам эканамічнага развіцця. Як паведаміў **генеральны сакратар ШАС Чжан МІН**, цяпер на тэрыторыі Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва больш чым 700 мільёнаў маладых людзей. Зразумела, гэта магутны рэсурс, таму і правядзенне тэматычнага форуму — унікальная ініцыятыва. «Пад эгідай Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва праходзіць шэраг важных мерапрыемстваў — у галіне бяспекі, эканоміκі, гуманітарнай сферы. Але форум у Шэньчжэне лічу знакавым, — адзначыў у сваім выступленні ў фармаце відэасувязі **першы намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Мікалай СНАПКОЎ**. — Менавіта энергія маладосці, яе кампетэнцыя, імкненне да стварэння і інавацый і ёсць будучыня».

Як адзначыў першы віцэ-прэм'ер, сёння Кітай упэўнена рушыць да сусветнага тэхналагічнага лідарства. «Гэта дае ўсім краінам прасторы ШАС перакананасць у тым, што палітычны і эканамічны суверэнітэт не супярэчаць тэхналагічнаму развіццю», — заўважыў Мікалай Снапкоў. Беларусь гатова адкрыта дзяліцца дасягненнямі моладзі, актыўна ўдзельнічаць у навукова-тэхналагічных абменах. Як перакананы Мікалай Снапкоў, многія дасягненні нашых маладых суайчыннікаў у межах гэтай ініцыятывы будуць запатрабаваныя ў многіх краінах. «Разлічваем на актыўны ўдзел маладых навукоўцаў у фарміраванні пула тэхнапаркаў ШАС, які накіраваны на інтэграцыю навуковай, адукацыйнай і вытворчай сферы агульнай прасторы, — падкрэсліў першы віцэ-прэм'ер. — Беларусь гатова актыўна падключыцца да практычнай рэалізацыі інавацый».

### ІТ-СТАЛІЦА ПАДНЯБЕСНАЙ

Шэньчжэнь нездарма быў абраны сталіцай гэтага форуму, адзначыў Мікалай Снапкоў. Агульная колькасць насельніцтва ў гэтым кітайскім мегаполісе яшчэ ў 2011-м перавысіла 15 мільёнаў чалавек, паведаміла «Жэньмінь жыбаа». За 42 гады з моманту стварэння горад прайшоў шлях ад невялічкага рыбацкага пасёлка да інавацыйнай сталіцы Паднябеснай і аднаго з сусветных цэнтраў інфармацыйных тэхналогій. Дзякуючы маштабным замежным і дзяржаўным інвестыцыям за даволі кароткі перыяд часу горадператварыўся ў буйны прамысловы, фінансавы і транспартны цэнтр эканамічнага рэгіёна дэльты Жамчужнай ракі і ўсёй краіны ў цэлым. «Шэньчжэнь — гэта зусім новы горад, створаны пасля пачатку рэалізацыі палітыкі «рэформаў і адкрытасці». Гэта цудоўная інтэрпрэтацыя сацыялізму з кітайскай спецыфікай», — такая ацэнка была дадзена старшынёй КНР Сі Цзіньпінам на святкаванні 40-годдзя стварэння спецыяльнай Шэньчжэньскай эканамічнай зоны ў 2020-м, згадаў Мікалай Снапкоў. За гэты час яе ВУП узрос у 10 тысяч разоў!

Як паведамілі ўлады Шэньчжэня, па выніках мінулага года амаль трэціна агульнага валавога рэгіянальнага прадукту была сфарміравана на кошт лічбавай эканомікі. У мегаполісе забяспечаны першы ў свеце поўны ахоп 5G. У 8K, штучным інтэлекце, секвеніраванні генаў, трохмерным адлюстраванні, транспартных сродках на новай энергіі, дронах і іншых галінах інавацыйныя магчымасці Шэньчжэня — наперадзе ўсёй планеты. Гэты кітайскі мегаполіс часта параўноўваюць з амерыканскай Сіліконавай далінай. У самім горадзе і яго навакollях засяродзілася звыш 11 тысяч лабараторый, цэхаў, заводаў, якія працуюць на ніве перадавых тэхналогій. Тут робяць тэлефоны Apple і Samsung. Тут базіруюцца кітайскія гіганты Huawei, Lenovo, Tencent, ZTE, якія сталі вядомымі на ўвесь свет.

Сёлета адбудзецца XX з'езд Камуністычнай партыі Кітая, на якім будзе названы грандыёзны план далейшага развіцця КНР, заўважыла **намеснік старшыні Пастаяннага камітэта Усетайскага сходу народных прадстаўнікоў, старшыня Камітэта Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва па добрасуседстве, дружбе і супрацоўніцтве Шэнь ЮЭЮЭ**. Яна адзначыла, што кітайскі бок вітае краіны прасторы ШАС у наладжванні плённых кантактаў з правінцыяй Гуандун і горадам Шэньчжэнем і выкарыстанне магчымасцяў падчас развіцця рэгіёна «Вялікага заліва» Гуандун — Сянган — Аамэнь у мэтах актывізацыі супрацоўніцтва і сумеснага развіцця.

### НА ВЕТРАЗЯХ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Як заўважыў на тэматычнай пляцоўцы Маладзёжнага навукова-тэхнічнага і інавацыйнага форуму ШАС **віцэ-прэзідэнт кампаніі Huawei Technologies Co., Ltd Ван ЧЭНДУН**, лічбавая эканоміка — адзін з драйвераў глабальнага развіцця. Ключавым элементам у гэтай мадэлі становяцца вялікія даныя. Цяпер лічбавая працэдура ў выглядзе падключэння да інтэрнэту ўсё больш мае патрэбу ў супраўджанні воблачных тэхналогій і штучнага інтэлекту. Усё гэта спрыяе развіццю электроннай камерцыі, належнаму міжнароднаму абмену таварамі і паслугамі. Тут не павінна стварацца штучных перашкод. Як заўважыў віцэ-прэзідэнт кампаніі Huawei, лічбавая эканоміка не мае межаў і фінальнай кропкі.

Адметна, што далёкі ад нас сусветна вядомы мегаполіс на поўдні Кітая і беларускую сталіцу звязваюць братэрскія сувязі. Шэньчжэнь і Мінск сталі пабрацімамі ў снежні 2014-га. Гарады маюць намер больш цесна супрацоўнічаць у сферы інавацый, развіваць высокатэхналагічныя вытворчасці і належным чынам выкарыстоўваць базу Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень».

Аб гэтым, у прыватнасці, вялася размова падчас сустрэчы на палях форуму **генеральнага консула Рэспублікі Беларусь у Гуанчжоў Андрэя ПАПОВА** з **дырэктарам канцылярыі знешніх сувязяў Народнага ўрада Шэньчжэня Цай САЙСЯНЬ**. Бакі абмяняліся думкамі па шэрагу перспектыўных напрамкаў актывізацыі супрацоўніцтва Беларусі і Шэньчжэня, у тым ліку ў кантэксце дзейнага пабрацімскага пагаднення паміж гэтым кітайскім мегаполісам і беларускай сталіцай. Перагаворы датычыліся навукова-тэхналагічных і адукацыйных абменаў, а таксама супрацоўніцтва па лініі Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень».

Па выніках глабальнага мерапрыемства была прынята Шэньчжэньская ініцыятыва. У ёй адзначаецца, што ў свеце адбываюцца нябачаныя за стагоддзе глабальныя змены. Форум заклікаў краіны да далейшага ўмацавання добрасуседства, паглыблення ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва, фарміравання ўсебаковай, шматканальнай і разнапланавай структуры ўзаемадзеяння. Як адзначаецца ў Шэньчжэньскай ініцыятыве, у постпандэмічную эпоху салідарнасць — гэта ветразь, а супрацоўніцтва — гэта вёслы, дзякуючы якім аб'ядналі намаганні, узаемадапамога і падтрымка краін дапамогуць разам пераадолець цяжкасці і рушыць у светлую будучыню.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У ЗША аб'яўлена надзвычайная сітуацыя



Гэта адбылося ў сувязі з пагрозай дэфіцыту электрагенерыруючых магутнасцяў, паведаміла РІА «Навіны». Рэжым надзвычайнай сітуацыі быў аб'яўлены амерыканскім лідарам Джо Байдэнам. Яго адміністрацыя патлумачыла падобныя крокі тым, што ў дадзены момант у ЗША існуе шэраг фактараў, якія могуць паўплываць на здольнасць краіны генерыраваць дастатковыя аб'ёмы электраэнергіі. У выніку ў ЗША можа паўстаць сітуацыя, калі электрычнасці, якая выпрацоўваецца, можа не хапіць на ўсіх спажыўцоў. Амерыканскія ўлады зараз спрабуюць вырашыць дадзеную праблему, у тым ліку за кошт імпарту сонечных модуляў з паўднёва-ўсходніх краін. На ўвоз такога абсталявання на працягу двух гадоў будзе знята пошліна. Акрамя таго, у Злучаных Штатах плануецца павялічыць вытворчасць уласных сонечных батарэй.

### Лідар італьянскай партыі папярэдзіў аб рызыцы наплыву паўмільярда мігрантаў

Лідар партыі «Ліга Поўначы» Матэа Сальвіні, экс-міністр унутраных спраў Італіі, асцерагаецца, што, калі канфлікт на Украіне зацягнецца, гэта можа прывесці да рызыкі наплыву да 500 мільёнаў мігрантаў і сацыяльнай катастрофы. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на агенцтва ANSA. «Пры ўзнікненні голаду нас чакае прыток мігрантаў. Ужо зараз ён рэкордны. Калі ў Афрыцы павялічыцца голад, ліча ў 500 мільёнаў мігрантаў цалкам рэальная. Яны накіруюцца да поўначы ў пошуках ежы», — прыводзіць словы Матэа Сальвіні агенцтва ANSA. Улады італьянскага вострава



Лампедуза паведамілі, што разлічаны на 350 чалавек мясцовы цэнтр часовага прыёму перапоўнены: там знаходзяцца 880 мігрантаў. Толькі мінулай ноччу на берагах вострава высадзіліся мігранты з дзевяці лодак. Паводле даных МУС, з пачатку года ў Італію па моры пераважна з Афрыкі прыбыла больш за 20 тысяч чалавек, што ў чатыры разы больш, чым за той жа перыяд у 2020-м.

### Ілан Маск абвінаваціў Twitter ва ўтойванні інфармацыі



Заснавальнік Tesla і SpaceX Ілан Маск абвінаваціў сацыяльную сетку Twitter у хаванні інфармацыі аб колькасці фэйкавых акаўнтаў. Прадстаўнікі Twitter адмовіліся падаваць бізнесмену інфармацыю аб колькасці фэйкавых і спамавых акаўнтаў. Прадпрымальнік такім чынам хацеў пераканацца, што колькасць падобных акаўнтаў у сацыяльнай сетцы не перавышае пяці працэнтаў. На фоне навін аб утойванні інфармацыі акцыі Twitter абваліліся на 3,92 працэнта. Як вядома, у сярэдзіне мая Ілан Маск прыпыніў здзелку па набыцці Twitter. Прычынай стала ўтойванне інфармацыі аб колькасці фэйкавых і спамавых акаўнтаў. Таксама заснавальнікі сацыяльнай сеткі адмовіліся прадставіць дадатковыя звесткі аб уласнай методыцы праверкі такіх звестак.

# НЕДЗІЦЯЧЫЯ ЗАБАВЫ


Фота з адкрытых крыніц.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Менавіта ў летні перыяд падлеткі часцей, чым звычайна, здзяйсняюць злачынствы і правапарушэнні. І гэта не толькі незаконны абарот наркатычных сродкаў, кіберзлачынствы. Асаблівую трывогу ў праваахоўнікаў выклікаюць і злачынствы, звязаныя з парагенератарамі. Прычым у адным выпадку падлеткі з'яўляюцца зламыснікамі, у другім — пацярпелымі.

— Апошнім часам у Мінску пачасціліся выпадкі, калі непаўналетнія вырашаюць стаць уладальнікамі парагенератараў, пры гэтым не хочуць плаціць за іх грошы, — расказвае **намеснік начальніка аддзела прафілактыкі ўпраўлення па ахове правапарадку і прафілактыкі ГУУС Мінгарвыканкама падпалкоўнік міліцыі Дзмітрый МЯЛЕШКА**. — Падлеткі шукаюць у інтэрнэце патэнцыйную ахвяру, дамаўляюцца аб сустрэчы ў людных месцах і на падставе агляду парагенератара з гэтай рэччу збягаюць, прысвойваючы яе сабе. Хацелася б нагадаць, што гэта не гульня і рабіць такое дзеля хайпу не варта: прадугледжана адказнасць у выглядзе пазбаўлення волі да васьмі гадоў, якая наступае з 14 гадоў.

Як паведамілі ў міліцыі, у апошні час пачасціліся злачынствы, звязаныя з махлярствам па тэлефоне. Дзяцей прыцягваюць у якасці кур'ераў, якія прымаюць ад грамадзян грошы на дапамогу сваякам, якія быццам бы трапілі ў бяду.

— Хачу нагадаць падлеткам і іх бацькам, што за такія дзеянні пагражае крымінальная адказнасць, якая прадугледжвае да 10 гадоў пазбаўлення волі, — адзначае Дзмітрый Мялешка. — Адказнасць за такі від злачынства пачынаецца з 16 гадоў. Шкоду, якую прычынілі падлеткі, у гэтым выпадку прыйдзецца кампенсаваць бацькам.

Трапляюць у поле зроку праваахоўнікаў і непаўналетнія, якія ўжываюць у грамадскіх месцах алкагольныя і слабаалкагольныя напоі. Калі дзеці не дасягнулі ўзросту прыцягнення да адказнасці (у гэтым выпадку 16 гадоў), то да адміністрацыйнай адказнасці будуць прыцягнуты іх бацькі. Пасля як бацькоў, так і падлеткаў чакаюць пэўныя наступствы: інфармаванне ўстаноў адукацыі, правядзенне індывідуальнай прафілактычнай работы супрацоўнікамі інспекцыі па справах непаўналетніх, а таксама ўвядзенне ў курс справы ўрачанарколага і правядзенне прафілактычнай работы з боку спецыялістаў.

Нагадаюць супрацоўнікі міліцыі і аб тым, што, нягледзячы на тое, што ў летні перыяд цямнее позна, затрымлівацца на вуліцы дзецям да 16 гадоў без суправаджэння дарослых не варта. У іншым выпадку за гэта прадугледжана адміністрацыйная адказнасць у адносінах да бацькоў, якія не забяспечылі суправаджэнне сваіх нашчадкаў пасля 23.00. Прычым бацькі павінны разумець, што такая бяспечнасць з іх боку часта прыводзіць да здзяйснення ў адносінах да падлеткаў адміністрацыйных правапарушэнняў і злачынстваў. Часта ў цёмны час сутак дзеці самі становяцца ўдзельнікамі незаконных дзеянняў.

## ШТО ПАВІННА НАСЦЯРОЖЫЦЬ?

Трывогу б'юць і супрацоўнікі наркакантролю: падлеткі не толькі ўжываюць забароненыя сродкі, але і распаўсюджваюць іх. У пагоні за лёгкімі грашыма дзеці становяцца злачынцамі, у выніку — паламаныя лёсы. Па статыстыцы Міністэрства ўнутраных спраў, звыш 90 % злачынстваў, звязаных з незаконным абаротам наркотыкаў, здзяйсняецца ў інтэрнэце. Улічваючы той факт, што ў большасці выпадкаў карыстальнікамі інтэрнэту з'яўляюцца маладыя людзі да 20 гадоў, злачынцы ўсё часцей уцягваюць іх у наркаабарот. Тое, што падчас летніх канікул падлеткі часта застаюцца без кантролю, толькі развязвае рукі арганізатарам такога віду незаконнай дзейнасці.

— Бацькам неабходна цікавіцца, як праводзіць час падлетак, — заўважае **начальнік упраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі ГУУС Мінгарвыканкама палкоўнік міліцыі Аляксандр САЗОНАЎ**. — У большасці выпадкаў такія маніпуляцыі з забароненым рэчывам здзяйсняюцца або ў вячэрні, або ў цёмны час сутак — для таго, каб застацца незаўважаным і не прыцягваць увагу з боку людзей. Варта сачыць і за з'яўленнем у дзіцяці новых прадметаў: вагаў, упаковак, пакетаў «зіп-лок», ізастужак або іншых прадметаў, якія дазваляюць расфасаваць рэчыва або яго ўпакаваць.

Нельга ігнараваць і змены ў паводзінах дзіцяці: асабліва павінна насцярожыць тое, што раней для падлетка было не ўласціва. Не варта ігнараваць і наяўнасць грашовых сродкаў у дзіцяці, з'яўленне ў яго новых дарагіх рэчаў. На жаль, дзеці становяцца яшчэ і спажыўцамі наркотыкаў. Праваахоўнікі расказваюць, што былі выпадкі, калі падлеткі, застаючыся без увагі бацькоў, прагульвалі ўрокі, знаходзілі закладку, спрабавалі яе пакаштаваць, а потым траплялі ў бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі, дзе дзяцей выцягвалі з таго свету. Па словах Аляксандра Сазонава, ні ў якім разе нельга раскрываць знойдзеныя пакецікі, а тым больш каштаваць тое, што ў іх утрымліваецца. «Гэта можа быць звычайны яд, які нехта спецыяльна падкінуў для іншых мэт», — тлумачыць начальнік упраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі. — У большасці выпадкаў гэта могуць быць наркотыкі, пра выяўленне якіх неабходна праінфармаваць органы ўнутраных спраў».

У міліцыі яшчэ раз нагадалі: усё, што звязана з абарачэннем наркатычных сродкаў, цягне за сабой крымінальную адказнасць. І адгаворкі накшталт «я яшчэ непаўналетні», як кажа моладзь, не «пракацяць»: адказнасць за распаўсюджванне наркотыкаў і псіхатропных сродкаў наступае з 14 гадоў. І дастаткова зрабіць усяго адну закладку, каб трапіць за краты.

З такога ўзросту падлеткі могуць быць прыцягнуты да адказнасці і за злачынную дзейнасць у інтэрнэце. Найбольш распаўсюджаныя кіберзлачынствы, удзельнікамі якіх становяцца дзеці, — супрацьпраўнае выкарыстанне чужых рэквізітаў банкаўскіх картак, разлік імі ие у гандлёвых аб'ектах, так і ў інтэрнэце.

— Абсалютная большасць такіх злачынстваў звязана з вішынгам і фішынгам, — паведамляе **начальнік упраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці ГУУС Мінгарвыканкама палкоўнік міліцыі Аляксей НОВАШ**. — Гэта ўдзел непаўналетніх у схемах, звязаных з так званымі абзвонамі або пераводам на падробныя інтэрнэт-старонкі, якія патрабуюць уводзення рэквізітаў банкаўскіх картак. У падобных злачынствах задзейнічана вялікая колькасць людзей. Моладзь нашу, як правіла, выкарыстоўваюць у двух выпадках: або для вываду ўжо скрадзеных грашовых сродкаў, або дзеля афамлення на іх банкаўскіх картак. Удзел у такіх схемах, нават у выглядзе бяскрыўднага афармлення на сябе банкаўскай карткі і яе перадачы трэцяй асобе або проста зняцця грашовых сродкаў з банкамата з'яўляецца саўдзельніцтвам у здзяйсненні злачынства, за якое наступае такая ж крымінальная адказнасць як і за непасрэднае выкананне злачынства.

Каб не дапусціць падобнага ў сваёй сям'і, праваахоўнікі рэкамендуюць бацькам мець са сваімі дзецьмі вербальныя зносіны: ведаць, з кім яны сябруюць, як праводзяць час, дзе знаходзяцца. Таксама варта звяртаць увагу на матэрыяльны дабрабыт падлеткаў і крыніцу паходжання грашовых сродкаў. Немалаважна і кантраляваць знаходжанне дзяцей у інтэрнэце.

Звяртаюць увагу супрацоўнікі міліцыі і на злачынствы, звязаныя са сватынгам — заранеей ілжывымі паведамленнямі аб небяспецы. «Перыядычна адбываюцца так званыя «мініраванні» шматлікіх аб'ектаў, — адзначае Аляксей Новаш. — Нярэдка несапраўдную інфармацыю ў кампетэнтныя органы даюць непаўналетнія. Крымінальная адказнасць за такія злачынствы таксама наступае з 14 гадоў. Максімальна правапарушальніку пагражае да сямі гадоў пазбаўлення волі. Кампенсацыя матэрыяльнай шкоды ўстанове, якую быццам бы замініравалі, ускладаецца на бацькоў. А гэта дастаткова сур'ёзная сума».

— Прывучаць дзіця адказваць за свае ўчынкі трэба з ранняга дзяцінства, — падкрэслівае **ўрач-псіхіятр, нарколаг, загадчыца падлеткавага наркалагічнага аддзялення Мінскага гарадскога наркалагічнага цэнтра Людміла ШПАКОЎСКАЯ**. — Сузалежнасць фарміруецца на другім годзе жыцця. Усё, што дае сям'я дзіцяці, тое ён потым і атрымлівае ў падлеткавым узросце. Зразумела, бацькі не могуць абараніць дзяцей ад інтэрнэт-рэсурсаў, гэта ўвайшло ў наша жыццё, але ва ўсім неабходны кантроль. Дзецям павінна быць больш цікава мець зносіны з бацькамі, чым сядзець у інтэрнэце. Вельмі сумна бачыць, калі мамы даюць тэлефоны паўтара-двухгадовым дзецям і ў гэты час спакойна займаюцца сваімі справамі. У выніку гэтае дзіця не адыдзе ад тэлефона, а потым мы будзем казаць аб залежнасці, якая фарміруецца і ад гульняў, і ад гаджэтаў.

**Вераніка КАНЮТА.**

---

Вялікі перапынак

# «УШАЦКАЯ ХВАЛЯ»: МЕСЦА СУСТРЭЧЫ НЕ ЗМЯНІЦЬ!

**Ці думалі вы над тым, як можна цікава і запамінальна завяршыць навучальны год? А што калі зрабіць гэта на прыродзе ў кампаніі аднадумцаў, з вогнішчам на беразе ракі, ствараючы пры гэтым карысныя і цікавыя праекты? У апошнія майскія дні на базе аздараўленчага лагера «Турослалле» на рацэ Дзвіва адбыўся ўжо другі педагагічны эдутон «Ушацкая хваля».**

Натхненне і жаданне вучыцца кіравалі тымі, хто ехаў на эдутон з розных куточкаў нашай радзімы: Мінска, Бабруйска, Маладзечна, Полаччыны, Светлагорска...

Жаданне, імпэт, энтузіязм — важныя фактары, але без дасканалай арганізатарскай падрыхтоўкі не можа абысціся ні адно мерапрыемства. Вялікую ролю ў гэтым адыгралі не толькі гаспадары — Ушацкі раённы аддзел па адукацыі і настаўніцкі клуб «Інсайт» на чале з Вольгай Жыткай. Не менш важнай была і дапамога сяброў: Алены Озеравай, Кацярыны Куксо і Кацярыны Беразняцкай.

Важна адзначыць, што фінансавыя пытанні па арганізацыі мерапрыемства ўдзельнікі і арганізатары вырашылі дастаткова проста: дзеля гэтага быў арганізаваны тыднёвы анлайн-марафон «Педагагічная скарбонка», падчас якога педагогі праводзілі платныя майстар-класы і зараблялі грошы на эдутон, а яшчэ шукалі для яго новых удзельнікаў. Для спікераў гэта было своеасаблівае валанцёрства, а для слухачоў — укладанні ва ўласнае развіццё...

> **Педагагічны эдутон** — гэта марафон, прызначаны для стварэння сумесных праектаў для навучэнцаў і іх бацькоў, а таксама для педагогаў.




І вось доўгачаканыя выхадныя! Прыезд, цёплая сустрэча, рэгістрацыя і пачатак. Фармат мерапрыемства традыцыйны: ёсць ідэя — выходзь і прэзентуй, няма — далучайся да іншых. У выніку «галасавання нагамі» (гэта «фішка» эдутона) вызначылася пяць каманд, якія шчыравалі над сваімі праектамі. Не абышлося без сюрпрызаў: у гэтым годзе ўдзельнікі выстаўлялі балы праектам, каб выбраць пераможцу, які па ўмовах атрымліваў каштоўны падарунак на першыя крокі рэалізацыі свайго праекта.

Нягледзячы на вопыт і майстэрства ўдзельнікаў, пакінуць настаўнікаў сам-насам са сваімі праектамі арганізатары не маглі, таму была створана ментарская падтрымка. Кожны ментар падзяліўся ўласным праектным досведам, а Кацярына Куксо пазнаёміла яшчэ і з крытэрыямі паспяховага праекта. Першы дзень праляцеў нібыта гадзіна, а ўвечары ўдзельнікаў чакалі мазгабойня, урокі танцаў і, вядома, вогнішча сяброўства са спевамі пад гітару.

Другі дзень — час прэзентаваць тое, над чым вялася руплівая праца. У выніку ўвазе калег былі прадстаўлены наступныя праекты. Мікола Атрахімовіч і настаўніцкая сям'я Кавалёвых прэзентавалі праект «Альтэрнатыўная гісторыя», скіраваны на вывучэнне гісторыі з дапамогай падарожжаў, работу з архівамі і рознымі крыніцамі інфармацыі.

Мэта праекта Алены Кашко і Людмілы Крыловай «Вяртанне, або Крок наперад» — арганізацыя дзевяцідзённага летніка для бацькоў і настаўнікаў, дзе апошнія маглі б пашыраць веды ў вывучэнні роднай мовы, культуры, гістарычнай спадчыны, з практычнымі заняткамі і майстар-класамі па саломапляценні, касьбе, вывучэнне народных песень, танцаў і г. д.

Праект Алы Шыдлоўскай «Падарожжа Жорыка» — спроба стварыць рэсурс завочных падарожжаў для навучэнцаў з вывучэннем славутасцяў Радзімы, а потым — з наступнымі афлайн-вандроўкамі да мясцін, якія даследаваліся папярэдне.

Ідэя педагагічнага клуба «Белая варона» Нікі Юхноўскай — стварэнне анлайн-суполкі педагагаў дзеля распаўсюджвання прафесійнага вопыту, наладжвання камунікацыі сярод настаўнікаў розных рэгіёнаў і абмену ідэямі і напрацоўкамі.

Праект Алены Марозавай і Уладзіміра Хамёнка «Здубавецце» мае экалагічную скіраванасць. Яго мэта — стварэнне новых форм работы ў галіне экалагічнага выхавання, прыцягненне да гэтай тэмы бацькоў і грамадскасці, а таксама шчыльнае супрацоўніцтва ўстановы адукацыі з органамі мясцовай улады і зацікаўленымі арганізацыямі. Адным са шляхоў рэалізацыі стваральнікі праекта вызначылі гульнявы элемент, прынцып якога — «гуляй і вучыся». Дзеля прыкладу быў распрацаваны пілотны экалагічны квэст «Наваколле», падчас якога ўдзельнікі не толькі выконваюць заданні на асобных лакацыях, атрымліваючы карысныя веды, але і займаюцца навядзеннем чысціні на тэрыторыі. Менавіта гэты праект, над якім працаваў дуэт, і перамог.

Падвядзенне вынікаў мерапрыемства праходзіла пасля сумеснага выканання настаўніцкай песні і абмену думкамі, пачуццямі і ўражаннямі. Усе сышліся ў адзіным: эдутону «Ушацкая хваля» ў наступным годзе быць!

**Уладзімір ХАМЁНАК, Вольга ЖЫТКАЯ, настаўнікі Ушацкай сярэдняй школы.**

# Лічбавая будучыня

## ў сённяшніх здабытках форуму ТІБА

**Перадавы вопыт у ІТ-індустрыі, найлепшыя сусветныя практыкі ў лічбавай сферы, перспектывы прымянення найноўшых тэхналагічных трэндаў у эканоміцы і развіццё ўмоў для лічбавых пераўтварэнняў Беларусі — усё гэта могуць пабачыць эксперты і наведвальнікі міжнароднага форуму ТІБА-2022, які праходзіць у Мінску. У мерапрыемстве ўдзельнічаюць найбуйнейшыя айчынныя і замежныя вытворцы тэлекамунікацыйнага абсталявання, апаратных сродкаў і праграмнага забеспячэння, кампаніі-аператары мабільнай і фіксаванай сувязі, распрацоўшчыкі і пастаўшчыкі высокатэхналагічных прадуктаў, сістэм бяспекі, інтэлектуальных рашэнняў і сэрвісаў для масавага і карпаратыўнага сегментаў, якія адзначаюць, што многія здабыткі Беларусі ў лічбавай сферы могуць быць узорам для выкарыстання на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы і краін Еўразійскай садружнасці.**




### У МЕЖАХ ЕЎРАЗЭС І САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ

Міжнародны форум — адно з мерапрыемстваў, якое падводзіць пэўную мяжу ІТ-развіцця ў краіне не толькі ў сферы эканомікі, але і ў сацыяльным кірунку, мяркуе **міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін ШУЛЬГАН:**

— Гэта паказ ужо распрацаваных праектаў, сустрэчы экспертаў, якія падчас круглых сталоў выпрацоўваюць рашэнні для далейшага развіцця. Аналізуючы гэтыя сустрэчы, мы будзем фарміраваць далейшы план развіцця і рыхтаваць мерапрыемствы, якія перавядуць ідэі ў практыку.

Беларусь сямімільнымі крокамі рухаецца па шляху лічбавай трансфармацыі сваёй эканомікі, з'яўляючыся адным з лідараў на еўразійскай прасторы, адзначыў **Варас СІМАНЯН, член калегіі (міністр) па ўнутраных рынках, інфарматызацыі, інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогіях Еўразійскай эканамічнай камісіі:**

— У краіне актыўна развіваецца нацыянальная інфармацыйная камунікацыйная інфраструктура, усе ўстановы адукацыі і аховы здароўя маюць шырокапалосны доступ да інтэрнэту, што дазваляе рэалізоўваць праекты па ўкараненні тэхналогій электроннай адукацыі і аховы здароўя, вядуцца работы па развіцці тэхналогій электроннага ўрада, створаны нацыянальны сегмент інтэграванай інфармацыйнай сістэмы Еўразійскага эканамічнага саюза, распрацаваны нацыянальны партал адкрытых даных.

Пэўныя тэхналогіі, якія яшчэ не ўкараняліся ў некаторых краінах, у Беларусі ўжо з'яўляюцца інструментамі будаўніцтва інфармацыйнага грамадства, дадаў **Нурудзін МУХІТДЗІНАЎ, генеральны дырэктар выканаўчага камітэта рэгіянальнай садружнасці ў галіне сувязі:**

— Гэта, прынамсі, рэалізацыя праграм лічбавай эканомікі ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі. Яшчэ падчас першых выставак ТІБА іх арганізатары разумелі, што тэлекамунікацыі — інструмент, які павінен існаваць, каб у краіне ўкаранялася лічбавая эканоміка. А яе не можа быць без фінансаў, то-бок банкаўскага сектара. Таму аб'яднанне тэлекамунікацыйных і банкаўскіх структур — залог рэалізацыі мэт устойлівага развіцця 2030. Нездарма гэтае аб'яднанне закладзена ў самой назве форуму ТІБА — тэлекамунікацыя і банкаўскае абсталяванне.

Лічбавую будучыню мадэлююць прафесіяналы і кампетэнцыі, якія яны маюць, таму сёння самае важнае — выпрацоўваць алгарытмы дзеянняў па далейшым развіцці. На сучасным этапе асаблівае значэнне маюць перспектывы лічбавага развіцця Саюзнай дзяржавы, падкрэсліла **Мар'яна ШЧОТКІНА, кіраўнік прадстаўніцтва Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы ў Мінску:**

— Лічбавая трансфармацыя ўнутраных рынкаў, транспартных калідораў, выкарыстанне лічбавых тэхналогій пры канструяванні разумных гарадоў і рэгіёнаў — важна, але яшчэ важней — імпартанезалежнасць ІТ-галіны.

### ІМПАРТАЗАМЯШЧЭННЕ, ВЫКЛІКІ, СУМЕСНАЕ РАЗВІЦЦЁ

Межы міжнароднага форуму пашыраюцца, сёлета да яго ўпершыню далучылася Чувашыя, якая прывезла на выстаўку свае найлепшыя дасягненні ў ІТ-сферы і гатовая актыўна дзяліцца вопытам.

— Чувашыя актыўна ўдзельнічае ў федэральных пілотных праектах па лічбе, уваходзіць у топ-20 рэгіёнаў Расіі па ўзроўні лічбавай сталасці, займае першае месца па лічбавізацыі спорту, — ахарактарызавала дасягненні краіны **Хрысціна МАЙНІНА, міністр лічбавага развіцця, інфармацыйнай палітыкі і масавых камунікацый Чувашскай Рэспублікі.**

Алтайскі край ужо мае традыцыйна моцныя сувязі з Беларуссю ў галіне сельскай гаспадаркі і сельгастэхнікі, перапрацоўчай прамысловасці, машынабудаўніцтве. І развіццё гэтых галін немагчыма без укаранення лічбавых тэхналогій, а форум — аснова для такой работы, упэўнены **Яўген ЗРУМАЎ, міністр лічбавага развіцця і сувязі Алтайскага краю:**

— Праграмныя дакументы, якія служаць асновай развіцця галіны ў Расіі і Беларусі, добра сінхранізаваны і маюць рэперныя кропкі, якія дазволяць сумесна рухацца далей. Гэта развіццё інфармацыйнай інфраструктуры, элементаў лічбавага дзяржаўнага кіравання, уплыў інфармацыйнай бяспекі з упорам на імпартазамяшчэнне.

> «Беларусь сямімільнымі крокамі рухаецца па шляху лічбавай трансфармацыі сваёй эканомікі, з'яўляючыся адным з лідараў на еўразійскай прасторы».

Сёлетні форум адбываецца ва ўмовах новых выклікаў, таму пытанні інфармацыйнай бяспекі, незалежнасці, міжнароднага супрацоўніцтва праходзяць стадыю пераацэнкі, лічыць **Уладзімір МАСЛАЎ, дырэктар Дэпартамента лічбавага развіцця Гандлёва-прамысловай палаты Расійскай Федэрацыі:**

— Прадпрымальніцкая супольнасць развівае новыя рашэнні, скіраваныя на рост і развіццё, вынікам якіх стане запуск новых праектаў, а таксама павышэнне канкурэнтаздольнасці эканомікі і дабрабыту грамадзян нашых краін. Лічбавізацыя большасці жыццёвых працэсаў — пытанне, неабходнае ў новай рэальнасці, а новыя выклікі сведчаць пра неабходнасць мець і ўкараняць уласныя лічбавыя тэхналогіі для павышэння эфектыўнасці ўсіх галін эканомікі і незалежнасці.

### ПЕРАГЛЕДЗЕЦЬ БІЗНЕС-ПРАЦЭСЫ

У рамках даручэння ўрада Беларусі — шэраг важных задач, у тым ліку з ухілам на лічбавую трансфармацыю. Прынамсі, летась у снежні створана агенцтва сэрвісізацыі і інжынірынгу, якое дапамагае зніжэнню адміністрацыйнай нагрузкі.

— Каб выканаць гэту задачу, мы хочам перагледзець усе бізнес-працэсы, якія задзейнічаны ў адміністрацыйных працэдурах і скіраваны на дапамогу айчыннаму бізнесу, каб скарацiць час, які трацiць бізнес на атрыманне канчатковай мэты, — расказаў **Арцём МАРОЗ, выканаўчы дырэктар Банка развіцця.** — За некалькі месяцаў мы сабралі высокакваліфікаваную каманду спецыялістаў з усёй краіны. Гэта людзі, якія дакладна разбіраюцца ў бізнес-працэсах. Мы шукаем ланцужкі, патрэбныя для дасягнення канчатковых мэт, каб бізнес змог прайсці ў пэўную кропку, зрабіўшы адзін зварот і атрымаўшы максімальна хуткі вынік.

Пра перавагі лічбавай сферы расказаў і **Юрый ПЕТРУЧЭНЯ, генеральны дырэктар «Белтэлекам»**, які нагадаў, што сёлета «Белтэлекам» стаў лаўрэатам прэміі ўрада Беларусі за дасягненні ў галіне якасці.

— Кампанія працягне работу, каб самыя перадавыя сэрвісы працавалі на павышэнне якасці жыцця людзей і стымулявалі ўстойлівы рост усіх галін эканомікі, — паабяцаў ён. — Аснова сёлетняй экспазіцыі кампаніі — праекты разумнага горада, стварэнне і развіццё якога — адзін з кірункаў лічбавай эканомікі. Асноўная ідэя канцэпцыі — павышэнне якасці жыцця, шырокае прымяненне інфармацыйных тэхналогій ва ўсіх сферах жыццядзейнасці, для чаго спатрэбіцца комплекс лічбавых рашэнняў. Сярод навінак таксама — мабільны дадатак «Мой універсітэт», уласная інтэрнэт-крама і тэматычная зона тэлевізійнага канала ЯСНАе TV.

> «Лічбавая трансфармацыя ўнутраных рынкаў, транспартных калідораў, выкарыстанне лічбавых тэхналогій пры канструяванні разумных гарадоў і рэгіёнаў — важна. Але яшчэ важней — імпартанезалежнасць ІТ-галіны».

«Белтэлекам» ужо стварыў разгалінаваную інфраструктуру валаконна-аптычных ліній сувязі і інфраструктуру сеткі Wi-Fi. А сёлета кампанія атрымала ліцэнзію аператара сотавай рухомай электрасувязі (сотавыя паслугі, як мяркуюць у «Белтэлекам», з'явяцца ў 2023-м). Каб пашыраць спектр сваіх сэрвісаў, кампанія плануе працаваць па мадэлі «віртуальнага аператара». Ужо сёлета мабільныя рашэнні будуць выкарыстаны для аказання канвергентных паслуг сувязі жыхарам невялікіх сельскіх населеных пунктаў і абанентам, якія не маюць доступу да праваднай інфраструктуры.

**У тэму**

# НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

Рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, падначаленыя ўраду Беларусі, аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму, да 1 чэрвеня 2023 года павінны забяспечыць размяшчэнне і захоўванне электронных дакументаў у аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэме «Ведамасны архіў». Захоўванне дакументаў у Ведамасным архіве дазволіць істотна скарацiць фінансавыя і часовыя затраты на ўтрыманне архіваў, а таксама зменшыць папяровы дакументаабарот у дзяржарганізацыях, упэўнены ў Нацыянальным цэнтры электронных паслуг (НЦЭП). Новыя магчымасці выкарыстання інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій вызначаны нядаўна падпісаным Указам Прэзідэнта № 188 «Аб пашырэнні выкарыстання дзяржаўнымі арганізацыямі інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій».

Указ дазволіць з дапамогай Адзінай сістэмы ідэнтыфікацыі фізічных і юрыдычных асоб перайсці да паэтапнага выкарыстання аддаленых метадаў ідэнтыфікацыі і аўтэнтыфікацыі фізічных і юрыдычных асоб пры аказанні электронных паслуг і ажыццяўленні адміністрацыйных працэдур, патлумачылі ў НЦЭП:

— Адзіная сістэма прызначана для прадастаўлення інфармацыйным сістэмам дзяржорганаў і іншых арганізацый Беларусі адзінага сэрвісу аўтэнтыфікацыі фізасоб і прадстаўнікоў юрыдычных асоб з выкарыстаннем ID-картак і сродкаў электроннага лічбавага подпісу (ЭЛП), у тым ліку з магчымасцю атрымання дадатковых звестак аб асобе, якіх няма на ID-картцы (рэгістрацыя месца жыхарства, сямейнае становішча, наяўнасць дзяцей). Электронныя дакументы, падпісаныя ЭЛП з выкарыстаннем ID-карткі, набудуць юрыдычную значнасць, у тым ліку з выкарыстаннем атрыбутных сертыфікатаў, якія вызначаюць дадатковыя правы і паўнамоцтвы ўладальніка ID-карткі.

Дакументам замацоўваецца магчымасць інфармацыйнага ўзаемадзеяння пасродкам агульнадзяржаўнай аўтаматызаванай сістэмы EDI-правайдараў (юрыдычных асоб, якія атрымалі атэстат аператара электроннага дакументаабароту) з мэтай перадачы і атрымання электронных накладных, а таксама транспартных (таварасуправаджальных) ці іншых электронных дакументаў, якія будуць пацвярджаць перамяшчэнне тавараў падчас узаемнага гандлю з іншымі дзяржавамі. Указ таксама ўносіць змены ў шэраг нарматыўных прававых актаў у частцы арганізацыйна-тэхнічнага ўзаемадзеяння дзяржорганаў і арганізацый пры пераводзе паслуг і адмінпрацэдур у электронны выгляд, падкрэслілі ў цэнтры.

Спецыялісты ўпэўнены, што прыняты ўказ дазволіць пашырыць сферу аказання электронных паслуг і адмінпрацэдур у электроннай форме, працягнуць развіццё электроннага ўраду і будаўніцтва праактыўнай дзяржавы. А таксама павысіць тэхналагічны ўзровень развіцця Беларусі як у нацыянальным, так і ў сусветным маштабе.

# Электронны асабовы рахунак і працоўная кніжка

**Гэтыя і іншыя цікавосткі ў сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій прадстаўлены на міжнародным форуме ТІБА.**

Электронныя лічбавыя сэрвісы прапануе «Белпошта». У прыватнасці, новы сэрвіс для юрыдычных і фізічных асоб, з дапамогай якога чалавек без удзелу аператара зможа адпраўляць пасылкі і карэспандэнцыю. На стэндзе арганізацыі наведвальнікам таксама пакажуць, як ідэнтыфікавацца і рэгістравацца з дапамогай ID-карткі. А яшчэ — як аплачваць паслугі з дапамогай электроннага асабовага рахунку.

Міністэрства працы і сацыяльнай абароны прадставіла лічбавыя рашэнні ў сацыяльна-працоўнай сферы. Спецыялісты пакажуць, як карыстацца мабільным дадаткам Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва, з дапамогай якога карыстальнік зможа праверыць, ці застрахаваны ён, ці папаўняецца яго рахунак інфармацыяй аб страхавых выплатах, а таксама даведацца пра свой страхавы стаж з пачатку 2003 года. Да канца года плануецца запусціць такія сэрвісы, як «электроннае пасведчанне сацыяльнага страхавання» і «электронная працоўная кніжка».

**Матэрыялы падрыхтавала Ірына СІДАРОК.**

Як гэта было

# ЗА ДАБРО ГРЭХ НЕ ПЛАЦІЦЬ ДАБРОМ...

**З гадамі ўсё менш і менш сярод нас ветэранаў вайны. Застаюцца хіба іншыя сведкі — дзеці, якія бачылі ўсе яе жахі альбо ведаюць іх па расповедах родных. Якраз з такіх — Вера Міхайлаўна Буркевіч, надзвычай сціплая абаяльная жанчына, цікавая тым, што нарадзілася ў Германіі, у горадзе Аўсіг, куды яе бацькоў вывезлі на прымусовыя работы. Аднак гэта было пазней, а спачатку...**





Іх, маладых і тады яшчэ незнаёмых (хоць раслі, за дзесяць кіламетраў, у вёсках аднаго Хаценчыцкага сельсавета), разам з іншымі прывезлі ў лагер, за калючы дрот, устанавілі 16-гадзінны рабочы дзень, кожны з якіх пачынаўся з размеркавання: хто — на завод, хто — у парабкі да гаспадароў. Здаралася, што тыя нават самі прыязджалі — адбіралі сабе работнікаў, шукалі, як расказвала маці Веры Міхайлаўны, дужэйшых і здаравейшых.

Аднак адкуль было брацца той сіле ды здароўю пры дрэнных умовах жыцця, пры гэткім харчаванні: ежы — нават звычайнай баланды — элементарна не хапала. Людзі рады былі кожнай бульбіне, кожнай перакінутай цераз дрот цыбуліне... А таму не дзіва, што нявольніка часта хварэлі і памiралі, што многіх даймала цынга.

Але ж часам здараўся і адпачынак, бывала, што немцы ладзілі для нявольнікаў танцы, нечым падобныя да нашых вячорак.

Якраз на такіх і ўбачылі адзін аднаго будучыя бацькі Веры Міхайлаўны, закахаліся і, як ні складана гэта было, пажаніліся. У 1944-м, на Каляды, у іх нарадзілася дачушка. Маладым бацькам з такой вось нагоды тады далі добрай ежы — варанай бручкі...

Жыць з немаўляткам у лагеры болей не выпадала — сям'ю забраў да сябе адзін з мясцовых гаспадароў. Меркавалася, што Ніна будзе ў доме за пакаёўку, Міхась на падворку — за даглядчыка скаціны. Так яно ўрэшце і выйшла, але ж з невялікімі прыгодамі. Справа ў тым, што спачатку, прыбіраючы ў доме, маладая работніца знаходзіла досыць каштоўныя рэчы. Здзіўлялася, што яны параскіданыя, што валяюцца, і тут жа аддавала гаспадарам.

Як высветлілася, такім чынам Ніну правяралі не толькі на працавітасць ды акуратнасць, але і на сумленнасць. Гаспадары вельмі цанілі гэтыя чалавечыя якасці і таму з павагай сталі ставіцца да новых работнікаў, а ўжо іх маленькую дачушку песцілі амаль як родную.

Бацькі Веры Міхайлаўны заўсёды помнілі гэта, а іх дачка да сёння захоўвае здымкі, на адным з якіх напісана: «На памяць Ніне, Мішу і Веры ад немкі». Імя там чамусьці не пазначана.

...Калі вайна ўрэшце скончылася, да гаспадароў прыйшлі нашы салдаты, сталі пытацца ў Ніны і Мішы, як ім было ў немцаў?

Пра ўсё гэтых, апошніх, Міша сказаў праўду: нічым не крыўдзілі, дапамагалі глядзець дзіця... І елі ўсе разам, за адным сталом.

Нашым салдатам, мусіць, рэдка даводзілася чуць ад наймітаў нешта падобнае, а таму адзін з іх сказаў гаспадару, што за здзекі з парабкаў яго з сям'ёй зараз жа маглі б паставіць да сценкі, а вось за дабро грэх не плаціць дабром...

Немцы былі вельмі ўдзячныя сваім работнікам за тое, што не схлусілі — сказалі праўду. І калі тыя ўсё ж навадзіліся ад'язджаць, вяртацца дадому, найстарэйшая, маці гаспадара, нават плакала — прасіла пакінуць ім маленькую Верачку.

...З Германіі ў Беларусь сям'я прыехала ў поўным складзе і, вядома ж, ліха тут хапіла напоўніцу. Жылі спачатку ў лазні. Міша з Ніной цяжка і шмат працавалі, гадавалі пяцярых дачок: старэйшая, Вера, старалася ва ўсім дапамагаць.

Пасля школы яна атрымала прафесію швачкі. Замуж выйшла за вясёлага гарманіста Жэньку: ён іграў, яна падпявала — голас і быў, і застаўся, якіх пашукаць!.. Потым працавала на шклозаводзе, а нарэшце — малаказборшчыцай у вёсцы Кавалі.

Такі вось лёс у Веры Міхайлаўны Буркевіч. Нарадзіўшыся ў Германіі (што, дарэчы, давялося даказваць у судзе, са сведкамі), яна ўсё сваё жыццё пражыла ў Беларусі. А вось сустрэцца з нашчадкамі тых немцаў, кажа, хацелася б.

На памяць аб іх засталіся толькі фотаздымкі...

**Алена МАЧЭЛЬ,**
**Вілейскі раён.**

Памяць

# ІМЕМ ЯГО НАЗВАНАЯ ВУЛІЦА...

**Сёлета ў красавіку споўнілася сто гадоў з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза Барыса Іванавіча Коўзана, які ў гады вайны (адзіны ў свеце!) здзейсніў чатыры тараны, 360 баявых вылетаў, правёў 127 баёў, збіў 28 самалётаў праціўніка.**



Нарадзіўся Барыс у Растоўскай вобласці, але вырас у Беларусі, бо яго сям'я пераехала спачатку ў Лагойск, а пасля — на радзіму бацькі, у Бабруйск. Там школьнікам хлопчык займаўся ў авіямадэльным гуртку і ў аэраклубе, там упершыню самастойна падняўся ў неба на вучэбным У-2.

Пасля заканчэння Адэскай ваеннай авіяцыйнай школы малодшы лейтэнант Барыс Коўзан быў накіраваны на службу ў 160-ы знішчальны авіяполк, які дыслакаваўся ў пасёлку Холмеч Гомельскай вобласці. Якраз тут вайскоўца заспела вайна.

Ужо на трэці яе дзень, 24 чэрвеня, лётчык Коўзан збіў свой першы нямецкі самалёт, а 29 кастрычніка таго ж 1941-га ў бітве пад Масквой здзейсніў першы таран... Потым былі другі, трэці... Пасля чацвёртага знакаміты лётчык перанёс некалькі складаных аперацый, дзесяць месяцаў правёў у шпіталі, але змог вярнуцца ў дзеючую авіяцыйную часць і збіць яшчэ шэсць самалётаў праціўніка.

...Службе ў авіяцыі Барыс Іванавіч прысвяціў і свае пасляваенныя гады: скончыў Ваенна-паветраную акадэмію, працаваў начальнікам Разанскага аэраклуба, выгадаваў двух сыноў (і, дарэчы, таксама лётчыкаў), з 1969 года жыў у Мінску, пахаваны з усімі воінскімі ўшанаваннямі на Паўночных могілках.

...У сталіцы на доме, дзе жыў герой, у гонар яго ўсталявана мемарыяльная дошка, у Бабруйску названая вуліца. Імя Барыса Іванавіча Коўзана залатымі літарамі выбіта ў Зале Перамогі музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Там жа, у музеі, беражліва захоўваюцца яго фотаздымкі і франтавыя лісты да бацькоў, ганаровыя граматы ды іншыя дакументы.

**Мікалай ШАЎЧЭНКА,**
**г. Мінск.**

На здароўе!

# Без таблетак можна абысціся

**У аптэцы сустрэў знаёмую, якая спехам паклала ў рот таблетку ад ціску, хоць яна, як потым прызналася, амаль не дапамагае...**

**Спытаў жанчыну, што яна п'е яшчэ. Адказала, што лечыць печань настоем святаянніку. А ён жа, як і большасць траў, утрымлівае горкія дубільныя рэчывы, якія, у сваю чаргу, павышаюць ціск. Вось таблеткі не спрацоўваюць.**

Я расказаў гэтай жанчыне, што ў маёй мамы (ёй за 80) ціск таксама павышаецца, але яна хіба зрэдку прымае папазол, нітрагліцэрын ці каптапрыл. А ў асноўным проста беражэцца: стараецца не падымаць больш за два кілаграмы, не рабіць рэзкіх рухаў, не закідваць галаву (як зрываючы яблык), доўга не працаваць сагнуўшыся.

Штодзень мама праходзіць пешшу 2-3 кіламетры, падтрымлівае нармальную вагу, не ўжывае чай, каву, алкаголь і ўсё горкае (здробненую цыбулю, часнок дадае ў стравы, калі яны ўжо зняты з пліты)... Але кожны дзень есць яблыкі (свежыя, сок, пюрэ, варэнне), п'е цёплую ваду (яна ачышчае арганізм ад таксінаў), не пераядае, нават летам ходзіць у закрытым абутку (ад холаду звужваюцца сасуды і — адпаведна — павышаецца ціск, амаль не ўжывае арэхі, семкі, халву, алей (яны таксама хутка і моцна звужаюць сасуды), стараецца адначасова рабіць дзве справы (глядзіць тэлевізар і шые або вяжа).

Немалаважна і тое, што мама заўсёды спакойная, добразычлівая, чым можа, дапамагае знаёмым і незнаёмым. Кажа, што добрыя справы сілкуюць розум і цела.

Нягледзячы на свой шаноўны ўзрост (ёй, паўтаруся, за 80), мама цікавіцца палітыкай, эканомікай, гісторыяй, медыцынай; наведвае бібліятэку; спаць не ляжа, пакуль не «аббяжыць увесь інтэрнэт», не даведаецца, дзе што адбылося, захоўвае аптымізм — нават захварэўшы.

А ціск яна зніжае так. Гарачай вадой хвілін пяць грэе рукі да пляча, потым ногі, п'е дзве-тры сталовыя лыжкі соку сырой бульбы, есць някіслы тварог, вараныя буракі, лёгкі амлет, на працягу дня выпівае па 50-100 грамаў адмысловага адвару. Для яго прыгатавання бярэцца 600-700 грамаў вады, па дзве сталовыя лыжкі ячменных і дробленых пшанічных круп. Усё разам 5 хвілін кіпіць і 30 — настойваецца.

Паніжэнню ціску спрыяе і лёгкая дыхальная гімнастыка (7-10 выдыхаў, якія павінны быць даўжэйшымі за ўдыхі) і медытацыя (самаўгаворванне): «позірк» унутр сябе з уяўленнем, як кроў ад сэрца ідзе да пляча, кончыкаў пальцаў — у правую руку, у левую. Потым ад сэрца праз жывот па сасудах — у ногі. Дыханне пры тым само запавольваецца, вуглякіслы газ пашырае сасуды... Гэта працуе. Можаце праверыць.

**Аляксандр ВАСІЛЬЕЎ,**
**г. Віцебск.**

Меркаванне

# «Не было б цяпер той краіны...»

**Ужо 20 гадоў я працую ў школе настаўнікам пачатковых класаў. Мне падабаецца мая работа: перадаваць дзецям веды, фарміраваць правільныя жыццёвыя пазіцыі. Цяпер гэта надзвычай важна, бо навокал столькі рознай інфармацыі... Мы, педагогі, павінны навучыць дзяцей фільтраваць яе, рабіць правільныя высновы.**

Адным з галоўных кірункаў у нашай рабоце з'яўляецца выхаванне патрыятызму. Для таго каб вучні ведалі і любілі сваю краіну, мала традыцыйных урокаў: трэба ладзіць для дзяцей ваенна-патрыятычныя гульні, экскурсіі па цікавых і памятных мясцінах, вочныя і завочныя сустрэчы з прадстаўнікамі розных прафесій, вядомымі людзьмі... Аднак найбольшую цікавасць у вучняў выклікаюць расповеды і ўспаміны ветэранаў Вялікай Айчыннай, а таксама іх узнагароды.

...З жахам назіраю, як у асобных краінах ставяцца да іх, да памяці пра герояў і ахвяр, жахаюся ад таго, што ўсё гэта бачаць дзеці. Наша задача — праўдзіва і даступна расказваць ім пра вайну, пра тое, якой цаной здабытая перамога, і што было б, калі б перамаглі не мы.

Гэтае пытанне, дарэчы, мне задавала адна з вучаніц на класнай гадзіне, і я адказаў ёй коратка: калі б мы не перамаглі, не было б цяпер той краіны, якую мы любім, не было б нашых дзядоў і бацькоў, не было б і нас.

**Анатоль АСКІРКА,**
**г. Быхаў.**

Свой погляд

# Помніць трэба ўсіх...

**У Год гістарычнай памяці часта згадваюцца падзеі, звязаныя з Вялікай Айчыннай вайной. І гэта не дзіва, бо жывыя яшчэ і самі франтавікі, і сведкі.**

У сродках масавай інфармацыі шмат размоў аб тым, якой цаной была здабытая перамога, правільна, што ўзнята праблема генацыду. Гэта не толькі маё меркаванне: так думаюць усе, каго называюць дзецьмі вайны, бо дзяцінства ў нас проста не было, асабліва ў сірот: пенсіі па страце кармільцаў мізэрныя, падаткі вялікія, грошай у калгасах не плацілі...

Я ўжо стары чалавек. Мне 86-ы год. Мой бацька, Емяльян Мікітавіч, загінуў восенню 1941-га пры абароне Масквы. Я і безліч равеснікаў змалку мусілі працаваць, разам са старэйшымі аднаўляць краіну і потым ганарыцца першым у свеце атамным ледаколам «Ленін», трыумфальным палётам Гагарына, Валянцінай Гаганавай — знакамітай ткачыхай, дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР, якая, дарэчы, жыла ў двухпакаёвай «хрушчоўцы»...

Ёсць розныя погляды на савецкую ўладу. «Дурости и жестокости» пры ёй сапраўды было дастаткова. Але ж пры гэтым адчыніліся дзверы для тых, хто хацеў вучыцца, хто імкнуўся нечага дасягнуць. У пасляваенны час у нашай Пірэвіцкай сярэдняй школе Жлобінскага раёна вучыліся будучыя члены-карэспандэнты Нацыянальнай акадэміі навук, адміралы і генералы, прафесары.

Як мы выжылі? Як нам даваліся поспехі-званні? Пра гэта мала хто ўспамінае. А трэба.

**Аляксандр ПЯТРУННІКАЎ,**
**г. Баранавічы.**

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

8 чэрвеня 2022 г. № 21 (657)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## Якім будзе IX Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі




Стала вядома праграма мерапрыемства

• Гродна прыме IX Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які пройдзе з 30 чэрвеня да 1 ліпеня. Сёлета тэма мерапрыемства — «Роля міжрэгіянальнага супрацоўніцтва ў паглыбленні інтэграцыйных працэсаў Саюзнай дзяржавы». Арганізатары, Савет Рэспублікі і Савет Федэрацыі, прадставілі праграму форуму.

У першы дзень, 30 чэрвеня, пройдуць секцыйныя пасяджэнні, прысвечаныя актуальным тэмам міжрэгіянальнага супрацоўніцтва. Сярод іх — «Заканадаўства Саюзнай дзяржавы: сучасны стан і асноўныя напрамкі далейшага збліжэння», «Супрацоўніцтва Расіі і Беларусі ва ўмовах новага міжнароднага кліматычнага парадку дня». Таксама спецыялісты абмяркуюць беларуска-расійскае ўзаемадзеянне ў сферы АПК як найважнейшую ўмову забеспячэння харчовай бяспекі Саюзнай дзяржавы. Адбудзецца секцыйнае пасяджэнне, прысвечанае адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы Расіі і Беларусі як фактару забеспячэння глабальнай канкурэнтаздольнасці і бяспекі Саюзнай дзяржавы». У праграме форуму — секцыі на такія тэмы, як «Інтэграцыя сістэмы вышэйшай адукацыі Расіі і Беларусі: рэгіянальны аспект», «Эфектыўнае імпартазамяшчэнне ў Саюзнай дзяржаве: праекты, стымулы, каардынацыя».

У рамках IX Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі пройдуць сумесныя пасяджэнні дзелавых саветаў Беларусі і Расіі, а таксама Прэзідыума Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь і Савета Палаты маладых заканадаўцаў пры Савеце Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі. Адбудзецца дзявятае пасяджэнне Міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве.

На другі дзень форуму, 1 ліпеня, Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава і Старшыня Савета Федэрацыі Валянціна Мацвіенка сустрэнуцца з кіраўнікамі органаў дзяржаўнай улады рэгіёнаў Беларусі і суб'ектаў Расіі. У праграме таксама — пленарнае пасяджэнне форуму з удзелам кіраўнікоў міністэрстваў і ведамстваў, органаў дзяржаўнай улады, прадпрыемстваў і арганізацый, прадстаўнікоў дзелавых колаў Беларусі і Расіі. Праграмай таксама прадугледжана падпісанне міжурадавых і міжрэгіянальных пагадненняў аб супрацоўніцтве.

• Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава сустрэлася з намеснікам Старшыні Савета Федэрацыі Расіі Юрыем Вараб'ёвым па пытаннях падрыхтоўкі да Форуму рэгіёнаў. Юрый Вараб'ёў расказаў, што 47 расійскіх рэгіёнаў хочуць удзельнічаць у гэтым форуме, 41 губернатар, 18 прадстаўнікоў заканадаўчых органаў збіраюцца прыняць удзел асабіста.

• У Гродне прайшло сумеснае пасяджэнне беларускага і расійскага арганізацыйных камітэтаў па падрыхтоўцы і правядзенні IX Форуму рэгіёнаў. «Мы разлічваем, што больш як 55 пагадненняў аб міжрэгіянальным супрацоўніцтве будзе падпісана, і такія прапановы да нас працягваюць паступаць. Кантрактная работа вядзецца ў рамках праграмы, якая пастаўлена кіраўнікамі дзяржаў па рэалізацыі 28 дарожных карт. Гэта своеасаблівая матывацыя, каб яны ўключыліся ў работу і на заканадаўчым узроўні, і на ўзроўні арганізацый. Разлічваем, што падпішам кантракты на суму больш як $1 млрд», — расказаў журналістам старшыня Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Міхаіл Русы.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## Наталля КАЧАНАВА:

# «БЕЛАРУСЬ — ПРЫКЛАД ТАГО, ЯК БУДАВАЦЬ НАШ АГУЛЬНЫ ДОМ ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ РОЗНЫХ РЭЛІГІЙ І НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЯЎ»

**У Гродне ў рамках XIII Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур адбыўся круглы стол «Беларусь — наш агульны дом: адзінства нацый і пакаленняў». У яго рабоце прыняла ўдзел Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталля КАЧАНАВА.**









Фота БелТА.

### Нагода ацаніць мір

Арганізатары мерапрыемства, а гэта Пастаянная камісія па адукацыі, навуцы і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі, міністэрствы інфармацыі і культуры, Гродзенскі аблвыканкам, сабралі на адной дыялогавай пляцоўцы лідараў грамадскай думкі — прадстаўнікоў рэспубліканскіх органаў упраўлення, мясцовага самакіравання, нацыянальна-культурных грамадскіх аб'яднанняў і беларусаў замежжа. Удзельнікі засяродзілі ўвагу на тых намаганнях, якія прыкладае дзяржава для захавання міру, згоды, этнічнай разнастайнасці і шматвяковай традыцыі пражывання прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў на адной тэрыторыі. Круглы стол стаў лейтматывам фестывалю нацыянальных культур у Гродне. А ў Год гістарычнай памяці мерапрыемства набывае асаблівае значэнне.

— Гэта яшчэ адна нагода ўспомніць, хто мы і дзякуючы каму жывём на свеце, — зазначыла ва ўступным слове Наталля Качанава. — Беларускі народ неадноічы прайшоў выпрабаванні цяжкасцямі вайны і пасляваеннага ліхалецця, таму, як ніхто іншы, цэніць мір і згоду. Глыбока разумее важнасць якаснай пераемнасці пакаленняў. Беларусь — прыклад таго, як будаваць наш агульны дом для людзей розных рэлігій і нацыянальнасцяў.

Сапраўды, у краіне жывуць прадстаўнікі 156 нацыянальнасцяў, дзейнічае звыш 3,5 тысячы зарэгістраваных рэлігійных арганізацый, 25 канфесій. Дзяржава забяспечвае захаванне гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, свабоднае развіццё ўсіх нацыянальнасцяў нашай краіны.

— У сучасным, жорсткім і цынічным свеце ў культуры важная і адказная місія — увасабляць у штодзённае жыццё маральныя нормы, берагчы грамадскую свядомасць ад нянавісці, хлусні і злосці, актыўна прасоўваць усё тое, што называецца чалавечнасцю. Толькі разам мы здолеем захаваць цывілізаваны парадак на нашай планеце, — лічыць спікер верхняй палаты.

Як высветлілася пры апошнім апытанні, якое было праведзена інстытутам сацыялогіі НАН Беларусі, прыярытэтам грамадства становіцца мірнае развіццё. На думку рэспандэнтаў, у краіне створаны ўмовы для раскрыцця патэнцыялу кожнага. Пры гэтым традыцыйныя сімвалы — зубр, бусел, зямля пад белымі крыламі — хоць і засталіся, але на першае месца выйшлі помнікі Вялікай Айчыннай вайны. Людзі разумеюць, як важна зберагчы мір і пачуць адно аднаго.

### У атмасферы адзінства

Гродзенскі рэгіён — адзін з самых шматнацыянальных у краіне. Так склалася гістарычна. Але гэта не стала перашкодай для мірнага суіснавання. Як зазначыў **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК,** людзі розных нацыянальнасцяў, рознага веравызнання заўсёды жылі тут у згодзе, дапамагаючы адно аднаму. Гэта дазволіла зрабіць гродзенскую зямлю такой, якую ўсе ведаюць і любяць.

— Я ўспамінаю, як два гады таму, калі была некаторая нестабільнасць па нашым знешнім контуры, Прэзідэнт жорстка сказаў: не ўздымайце нацыянальнае пытанне. Калі людзі жывуць у міры на нашай зямлі — гэта нашы людзі: палякі, украінцы, татары... Усе яны — грамадзяне Беларусі. І мы ніколі не перашкаджалі захоўваць і развіваць іх нацыянальную самабытнасць, — заўважыў кіраўнік рэгіёна.

стар. 8

# «БЕЛАРУСЬ — ПРЫКЛАД ТАГО, ЯК БУДАВАЦЬ НАШ АГУЛЬНЫ ДОМ ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ РОЗНЫХ РЭЛІГІЙ І НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЯЎ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

**Міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ** адзначыў, што людзі тут, на гродзенскай зямлі, спакон веку так жылі. Тут ніхто не дзеліць людзей па нацыянальных прыкметах. Каб у гэтым упэўніцца, міністр прапануе адкрыць даведнік кіруючых асоб Гродзенскай вобласці. І пытанне аб нейкім нацыяцэнтрызме папросту адпадае — настолькі шматнацыянальны гэты спіс.

> Беларускі народ неаднойчы прайшоў выпрабаванні цяжкасцямі вайны і пасляваеннага ліхалецця, таму, як ніхто іншы, цэніць мір і згоду. Глыбока разумее важнасць якаснай пераемнасці пакаленняў. Беларусь — прыклад таго, як будаваць наш агульны дом для людзей розных рэлігій і нацыянальнасцяў.



Фота БелТА.

Таму лагічна, што менавіта тут нарадзілася ідэя правядзення фестывалю з нацыянальным каларытам. Пробны шар, які быў пушчаны больш за чвэрць стагоддзя таму, аказаўся ўдалы. Больш за тое, свята стала брэндавым у рэгіёне. Яго палюбілі як самі ўдзельнікі суполак, так і многія беларусы, якія спецыяльна прыязджаюць на гэты фэст у Гродна. Многія лічаць яго ўнікальным, які не мае аналагаў у свеце. Таму сімвалічна, што і тэматычны круглы стол праходзіць у рамках фестывалю. Форум ужо сфарміраваў сваю гісторыю, традыцыі і стаў важнай падзеяй у жыцці краіны.

— Больш за чвэрць стагоддзя мы назіраем за развіццём фестывальнага руху, — паведаміў падчас круглага стала **міністр культуры Анатоль МАРКЕВІЧ.** — Тады быў створаны і рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур. Пры ім штогод праводзіцца больш чым 400 разнапланавых мерапрыемстваў з удзелам прадстаўнікоў дыяспар. Яны — пастаянныя ўдзельнікі многіх усебеларускіх свят. Гэта «Славянскі базар», «Сожскі карагод», «Кліч Палесся», «Вянок сяброўства» і іншыя. Вядзецца актыўная работа з беларусамі замежжа. Для іх творчых калектываў шыюцца касцюмы, праводзяцца стажыроўкі.

Дарэчы, сёлетні фестываль у гэтым сэнсе адметны. Упершыню ў ім прынялі ўдзел беларусы замежжа. Як расказала падчас тэлемоста **старшыня праўлення Саюза беларусаў Латвіі Алена ЛАЗАРАВА,** беларускія таварыствы вядуць сваю дзейнасць у розных гарадах, выступаюць на святах і фестывалях. Дзякуючы рабоце рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур усе творчыя калектывы маюць прыгожыя нацыянальныя касцюмы, мастацкую літаратуру, метадычны матэрыял, удзельнічаюць у стажыроўках. Зараз там пражывае 65 тысяч беларусаў. Асаблівая радасць для творчых калектываў — гэта паездка ў Беларусь. «Мы з нецярпеннем чакаем такую магчымасць і вельмі рады, што змаглі выступіць у Гродне», — рэзюмавала Алена Лазарава.

> Маладое пакаленне, якое вырасла ў шматнацыянальнай суверэннай Беларусі, успрымае сваіх калег з іншых дзяржаў як сяброў, гэта палітыка ўключана і ў адукацыйны працэс.

## Правы замацаваны законам

У Беларусі няма канфліктаў на рэлігійнай і этнічнай глебе. Талерантнасць здаўна з'яўляецца рысай характару беларусаў, ды і ўвогуле ўсіх, хто тут пражывае. Калі ў Беларусь прыязджаюць перасяленцы з іншых краін, якія вымушаны ратавацца ад войнаў ці стыхійных катаклізмаў, іх тут сустракаюць гасцінна і добразычліва. Пры гэтым яны абароненыя і ў прававым аспекце. Як расказаў удзельнікам круглага стала **Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр РУМАК,** на дзяржаўным узроўні створаны ўсе неабходныя прававыя ўмовы для рэалізацыі роўных правоў грамадзян, незалежна ад іх веравызнання і нацыянальнасці.

Згодна з артыкулам 14 Канстытуцыі Беларусі, дзяржава рэгулюе адносіны паміж сацыяльнымі, нацыянальнымі і іншымі супольнасцямі на аснове прынцыпаў роўнасці перад законам, павагі іх правоў і інтарэсаў. У адпаведнасці з Законам аб нацыянальных меншасцях, у Беларусі не дапускаецца ніякае абмежаванне правоў і свабоды грамадзян за іх прыналежнасць да нацыянальнай меншасці, а таксама пробы асіміляцыі супраць іх волі. Наадварот, нацыянальныя меншасці могуць ствараць аб'яднанні, як на рэспубліканскім, так і мясцовым узроўнях. І такіх аб'яднанняў ужо больш за 200. Яны таксама маюць права сумесна выпрацоўваць нейкія важныя рашэнні.

> У сучасным, жорсткім і цынічным свеце ў культуры важная і адказная місія — увасабляць у штодзённае жыццё маральныя нормы, берагчы грамадскую свядомасць ад нянавісці, хлусні і злосці, актыўна прасоўваць усё тое, што называецца чалавечнасцю.

— Апаратам упаўнаважаных, міністэрствамі і абласнымі органамі ўлады аказваецца метадычная, арганізацыйная і фінансавая дапамога нацыянальным культурным і грамадскім аб'яднанням. За кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту ў 2021 і 2022 гадах у рамках дзяржпраграмы «Культура Беларусі» закуплены і перададзены нацыянальным аб'яднанням сцэнічныя касцюмы, музычныя інструменты, — расказаў Аляксандр Румак.

У мінулым годзе ў Савеце Рэспублікі адбыўся круглы стол на тэму «Міжнацыянальны мір і згода як аснова адзінства беларускага народа», у рамках якога былі прадстаўлены вопыт работы Кансультатыўнага міжэтнічнага савета і некаторых дыяспар. Дарэчы, Міжэтнічны савет быў створаны ў 2006 годзе. Стварэнне гэтага органа, па словах упаўнаважанага, сведчыць аб адсутнасці канфрантацыі паміж нацыянальнасцямі, якія пражываюць у Беларусі, дае магчымасць ім самім каардынаваць сваю грамадскую дзейнасць, атрымліваць дзяржаўную падтрымку на роўных правах. У складзе савета — кіраўнікі нацыянальна-культурных аб'яднанняў.

## Задзейнічаць школы

Тэндэнцыя да талерантных міжнацыянальных адносін працягваецца і ў новых пакаленнях, лічаць прадстаўнікі маладзёжных арганізацый. Бо маладое пакаленне, якое вырасла ў шматнацыянальнай суверэннай Беларусі, успрымае сваіх калег з іншых дзяржаў як сяброў, гэта палітыка ўключана і ў адукацыйны працэс. Па словах **старшыні Маладзёжнага парламента Ягора МАКАРЭВІЧА,** многія праекты якраз і скіраваны на развіццё нацыянальнага дыялогу. Напрыклад, БРСМ ініцыіруе правядзенне першага форуму з маладымі святарамі.

— Ёсць думка, што маладзёжныя арганізацыі абстрагаваны ад рэлігіі, але гэта не так. І яркі прыклад таму — наш праект «Аднаўленне святынь Беларусі». Толькі ў мінулым годзе беларуская моладзь аднавіла звыш 340 святынь, пасля такіх работ адбываліся гутаркі са святарамі, — расказаў падчас круглага стала **першы сакратар БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ.**

**Міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ** лічыць, што ў выхаванні маладога пакалення трэба больш задзейнічаць патэнцыял школ. І гэту работу варта вывесці на новы ўзровень. Разам з тым патрэбна захаваць усё каштоўнае, што было выпрацавана ў папярэднія дзесяцігоддзі.

Наталля Качанава ідэю падтрымала і прапанавала аднавіць традыцыі, якія існавалі раней. У прыватнасці, наладжваць адносіны з вучнямі іншых краін.

— Напрыклад, мы ў школьныя гады дружылі з узбекскай школай. Мы не ездзілі да іх, але абменьваліся пасылкамі, пісьмамі. У нас былі святы, дзе мы выступалі ва ўзбекскіх касцюмах. І такія адносіны паміж школьнікамі варта аднавіць, за гэтым будучыня. Тым больш зараз столькі тэхнічных магчымасцяў для зносін, — лічыць Старшыня Савета Рэспублікі.

## Новая традыцыя

Увогуле, грамадскасць не павінна заставацца ўбаку ад працэсаў, якія адбываюцца ў свеце. Фарміруюцца новыя правілы гульні, і Беларусь павінна заняць годнае месца ў будаванні новага свету, лічыць **член Савета Рэспублікі, рэктар Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта Алег РАМАНАЎ.** На яго думку, самы важны прынцып ідэалогіі, які патрэбен усім, — адзінства. І ў фестывалю нацыянальных культур якраз выпрацоўваецца ідэалогія такога светапогляду.

> У Беларусі няма канфліктаў на рэлігійнай і этнічнай глебе. Талерантнасць здаўна з'яўляецца рысай характару беларусаў, ды і ўвогуле ўсіх, хто тут пражывае.

Падводзячы вынікі круглага стала, Наталля Качанава выказала спадзяванні, што такія сустрэчы стануць традыцыйнымі. Гэта важна і ў плане работы з законапраектамі, якія павінны быць актуальнымі, ісці ад жыцця. Таму Савет Рэспублікі актыўна ўключаецца ва ўсе працэсы, якія ідуць у краіне, падкрэсліла спікер.

Завяршыла работу круглага стала «Беларусь — наш агульны дом: адзінства нацый і пакаленняў» прыняцце звароту да сусветнай грамадскасці. У ім, у прыватнасці, была падкрэслена прыхільнасць высокім прынцыпам сяброўства народаў, мірнага суіснавання розных культур і рэлігій. Удзельнікі круглага стала заклікаюць прадстаўнікоў усіх нацыянальнасцяў пачуць іх голас дзеля кансалідацыі, незалежна ад рэлігіі, палітычных і асабістых поглядаў. Бо галоўны набытак чалавецтва — гэта мір і згода, якія трэба перадаць будучым пакаленням.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# ДЛЯ МАЛЫХ ВЁСАК І АГРАГАРАДКОЎ

## На сесіі Брэсцкага аблсавета падвялі вынікі спаборніцтва сярод сельсаветаў

**Такі агляд праводзіцца ў вобласці з 2009 года. Як адзначыў старшыня абласнога Савета Юрый НАРКЕВІЧ, пры падвядзенні вынікаў спаборніцтва да ўвагі бярэцца шмат крытэрыяў: гэта і добраўпарадкаванне тэрыторыі, азеляненне населеных пунктаў, а таксама вырашэнне сацыяльных пытанняў, бытавое і гандлёвае абслугоўванне, работа устаноў культуры — адным словам, усё, ад чаго залежыць якасць жыцця вясковага чалавека.**

### 3 пашанай да мінулага

Быць пераможцам у конкурсе — не толькі прэстыжна, але і выгадна. Прэмію можна выкарыстаць на далейшае добраўпарадкаванне і паляпшэнне, што паспяхова робіць мясцовая ўлада. Пераможцы гэтага года таксама разам з дыпломам атрымлівалі сертыфікат на грашовую прэмію: за першае месца — 500 базавых велічынь, за другое — 400, за трэцяе — 300. Прыемна, што абсалютная большасць герояў дня былі ў розны час героямі публікацый «Мясцовага самакіравання».



Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

Юрый НАРКЕВІЧ уручае ўзнагароду Пятру НАЗАРУКУ.

Першае месца заваяваў сёлета Хідрынскі сельскі Савет Кобрынскага раёна. Яго **старшыня Пётр НАЗАРУК** адзначае, што на тэрыторыі сельсавета актыўна вядзецца будаўніцтва жылля. «Зараз разбілі пяць новых кварталаў жылой забудовы, — гаворыць Пётр Сяргеевіч. — Калі людзі ўзводзяць дамы, значыць, вёска жыве, у яе ёсць будучыня».

У згаданым сельсавеце не толькі клапоцяцца пра сённяшні дзень, але і з вялікай павагай ставяцца да гісторыі. Прыведзены ў парадак і дагледжаны помнікі ваенным падзеям. Не так даўно старшыня паказваў аўтару гэтых радкоў помнік каля вёскі Корчыцы. Невялікі абеліск стаіць на месцы гібелі сям'і Загрэбаў. За сувязь з партызанамі акупанты расстралялі сем чалавек, у тым ліку 12-гадовую дзяўчынку і маладую жанчыну на дзявятым месяцы цяжарнасці. Трагедыя адбылася 15 лютага 1943 года. На гэтым месцы стаяў спачатку сціплы помнік, пастаўлены сваякамі забітых, але на пачатку 2000-х тут устанавілі мармуровую дошку з імёнамі загінулых, а пра помнік цяпер клапоціцца мясцовая ўлада.

З дапамогай сельвыканкама крыху больш за год таму ўшанавалі памяць земляка, ураджэнца вёскі Каташы, ваеннага марака Аляксандра Лісковіча. Сорак гадоў таму Саша Лісковіч служыў на падводнай лодцы С-178 Ціхаакіянскага флоту, якая ў 1981 годзе пацярпела катастрофу. 20-гадовы марак і яго таварышы перакрылі і загерметызавалі свой чацвёрты адсек, каб пакінуць паветра і шанс трэцяму адсеку, такім чынам выратавалі жыцці іншым цаной уласных. Іх пахавалі ў лістападзе 1981 года ў брацкай магіле ва Уладзівастоку. Дакументы засакрэцілі, пра трагедыю забыліся ў маштабах краіны. А потым і краіны не стала.

І вось праз сорак гадоў у Хідрынскі сельсавет ліст прыслаў старшы памочнік капітана карабля Сяргей Кубынін. Закіпела пошукавая работа, якую разгарнула мясцовая школа. І ў 2021 годзе на Хідрынскай школе з'явілася мемарыяльная дошка ў гонар вучня, што здзейсніў подзвіг.

### Спаборніцтва за найлепшую сядзібу

Другое месца падзялілі паміж сабой два сельсаветы — Відамлянскі Камянецкага раёна і Рэчыцкі Столінскага.

У Відамлі азеляненнем і навядзеннем прыгажосці займаюцца многія гады. У вёсцы становіцца ўсё болей добраўпарадкаваных і ўпрыгожаных сядзіб. У практыку ўвайшло спаборніцтва на найлепшую з іх. «Паступова гэта ўжо стала нормай грамадскага жыцця, нікога асабліва не трэба агітаваць альбо прымушаць, — канстатуе **старшыня сельскага Савета Марына КАРАЛЮК.** — Галоўнае — вяскоўцы захапіліся ідэяй упрыгожвання свайго побыту. Кожнае лета камісія сельсавета абыходзіць падворкі, робіць фотаздымкі, каб зімой падчас падвядзення вынікаў афарміць стэнды і прадставіць дакументальныя сведчанні намаганняў пераможцаў».

Вынікі падводзяць сумесна сельскі Савет і адкрытае акцыянернае таварыства «Відамлянскае». Нават падзячныя лісты падпісваюць два кіраўнікі. Праводзіцца ўрачыстае мерапрыемства, дзе ўшаноўваюць перадавікоў мінулага года. У зале ладзіцца фотавыстава, падчас якой нярэдка можна пачуць: «Няўжо так прыгожа было ў маім двары?»

Вялікая заслуга ў справах добраўпарадкавання мясцовай школы. Сёння школа вырошчвае да 90 працэнтаў расады аднагадовых раслін, якія ўвесь сезон упрыгожваюць вуліцы і плошчы вёскі. Школа падтрымлівае ў парадку не толькі сваю тэрыторыю, але і даволі вялікую прыдарожную паласу. Тут з'явіліся прыгожыя арыгінальныя клумбы, якія час ад часу



Дошка ў гонар Аляксандра Лісковіча ў Хідрынскай школе.



Старшыня Відамлянскага сельсавета Марына КАРАЛЮК.

мяняюць форму і колеравую гаму. Цікавая гісторыя з кветкавай кампазіцыяй у выглядзе зубра. Яе ўладкавалі на абочыне дарогі на Белавежскую пушчу. Некалькі сезонаў клумба квітнела рознымі колерамі, а потым вырашылі па звычцы памяняць яе форму на іншую. Але нехта з настаўнікаў заўважыў, што менавіта каля гэтай клумбы часта спыняюцца і фатаграфуюцца турысты. І яна тут вельмі да месца, бо мае брэндавае значэнне. «Выйшла як з той Эйфелевай вежай, — жартуюць у школе. — Будавалі на час выставы, потым хацелі разбурыць, а аказалася, што вежа — ужо славутасць. Так і наш зубр: мы яго пакінулі, толькі кожны сезон напаўняем новымі адценнямі». Школа даглядае ладны кавалак прыдарожнай паласы, тэрыторыю царквы, падтрымлівае ва ўзорным парадку ўласны двор.

Акрамя Відамлі, у склад сельсавета ўваходзіць нямала малых вёсак. Каб іх падтрымаць, у тым ліку ў плане добраўпарадкавання, задумалі фестываль малых вёсак пад назвай «Вёсачка мая — мая чараўніца». Кожны год у адным з такіх населеных пунктаў праводзіцца свята вёскі, да якога ідзе падрыхтоўка фактычна цэлы год. А на вясковы фэст збіраюцца ўсе пакаленні вяскоўцаў, дзеці, унукі прыязджаюць нават здалёк. Сельгаспрадпрыемства не абыходзіць увагай ніводнага былога працаўніка, падарункі ўручаюцца ўсім калгасным пенсіянерам, ушаноўваюць цяперашніх працаўнікоў, калі такія ёсць. Гаспадыні дастаюць з куфраў вышыванкі і посцілкі, дэманструюць таленты кулінарыі. Усе святы — «Грушаўскі світанак», «Баранкаўскі завітанак», «Млыноўскі бярэжок», «Куфар Радасці», «Гасцёўня на Лясной», «Мядовы чай на Панскім» — прайшлі вельмі душэўна, цікава, пакінулі ўдзельнікам незабыўныя эмоцыі. У сельскім Савеце захоўваюцца цэлыя альбомы са здымкамі з тых мерапрыемстваў, там цэлы стос падзячных водгукаў — найбольш ад нашчадкаў сталых жыхароў, якія выбраліся на свята і сустрэліся з аднакласнікамі, аднавяскоўцамі, акунуліся ў юнацтва.

Некалькі гадоў таму ў цэнтры вёскі з'явілася рэкрэацыйна-навучальная пляцоўка «Лабараторыя сонца». Пачыналася, як заўсёды, з ініцыятывы неабыякавых жыхароў. Спачатку за адміністрацыйным будынкам уладкавалі стары сад. Яго пачысцілі, абнавілі. Неаварыйныя дрэвы пакінулі, дабавілі новых — сад ажыў. Потым афармілі свае намеры дакументальна і выйгралі грант на конкурсе мясцовых ініцыятыў «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні». На атрыманыя грошы ўсталяваны пешаходныя дарожкі, сем свяцільнікаў, чатыры сонечныя панэлі і два стэнды па энергазберажэнні. Тут размяшчаецца інфармацыя на тэму эканоміі і беражлівасці.

Энергіі ўстаноўленых сонечных батарэй хапае, каб асвятляць названую пляцоўку круглы год. Тут жа ўладкаваны разеткі для зарадкі мабільных прыстасаванняў. Адпачываеш і зараджаеш тэлефон альбо планшэт. За кошт сельвыканкама на пляцоўцы паставілі садовыя лаўкі. Пазней з'явілася дзіцячая пляцоўка. Сродкамі на яе дапамог райвыканкам.

— Адным словам, добрую справу адолелі ўсёй грамадой, — падсумоўвае старшыня сельскага Савета Марына Каралюк. — І цяпер многае па добраўпарадкаванні і паляпшэнні тэрыторыі таксама робім разам.

### Парк у Ніжнім Церабяжове

Другое месца з Відамлянскім падзяліў Рэчыцкі сельсавет Столінскага раёна. Яго **старшыня Вадзім ЗАРУБА** расказаў карэспандэнту «МС», што галоўнымі дасягненнямі добраўпарадкавання мінулага года лічыць пракладку асфальту на ўчастках дарог у Ніжнім Церабяжове, Варанях, Рэчыцы, а таксама газіфікацыю вёскі Варані. Апошняе палепшыла якасць жыцця ўсіх вяскоўцаў.



Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

Узнагароду атрымлівае Вадзім ЗАРУБА.

У сельсавеце таксама ажыццяўляюцца і мясцовыя праекты. Такія, напрыклад, як добраўпарадкаванне парку ў Ніжнім Церабяжове.

— Наш парк унікальны, — гаворыць Вадзім Заруба. — Гэта на 90 працэнтаў захаваны парк старадаўняй сядзібы XIX стагоддзя. Біялагічная разнастайнасць флоры і фаўны здзіўляе вучоных. Тут растуць рэдкія і зусім рэдкія ў нашых шыротах дрэвы і кусты, жывуць птушкі-чырванакніжнікі. А паркавая сажалка служыць своеасаблівым жывым музеем, яна ўтворана шляхам пашырэння прыроднага ручая. Побач з сажалкай адкрываюцца фантастычныя па прыгажосці краявіды. Вось гэты парк мы ўзяліся падчысціць, вызваліць ад лішніх зараснікаў і кустоўя. Такім чынам ужо палепшылі пяць гектараў з дванаццаці. На цэнтральнай дарожцы ўстанавілі лаўкі, аднавілі ўваходную браму. Работа працягваецца.

У гэтым матэрыяле згаданы сельсаветы, якія занялі першае і другое месцы ў спаборніцтве. Трэцімі прызёрамі сталі Лясковіцкі сельсавет Іванаўскага і Хатыніцкі Ганцавіцкага раёнаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**



Старадаўні парк.

# ЭКСПАНАТЫ КАМУНАЛЬНАГА ПАХОДЖАННЯ

## Дырэктар Бяльніцкага «Жылкамгаса» сабраў цэлую калекцыю прадметаў, якія перашкаджалі якаснай рабоце прадпрыемства

**Віктар ІВУЛЕЎ у сістэме Бяльніцкай ЖКГ працуе ўжо 34 гады, ведае ўсе тонкасці камунальнай справы. Пачынаў з майстра і дарос да дырэктара прадпрыемства. Пад яго кіраўніцтвам яно неаднаразова займала прызавыя месцы на ўсіх узроўнях, у кабінеце — сцяна з дыпломамі і падзякамі. Сёлета Віктар Міхайлавіч быў адзначаны ганаровым званнем «Чалавек года Магілёўшчыны» па выніках работы за мінулы год. Засталося дадаць, што гэты прафесіянал з вялікай літары яшчэ і народны абраннік. У раённым Савеце дэпутатаў ён займае пасаду намесніка старшыні.**



Калі размаўляла з ім пра паказчыкі і аб'ёмы, звярнула ўвагу на тое, што, акрамя фота і грамат, у кабінеце ёсць яшчэ і шафа з незразумелымі прадметамі, якія на першы погляд нагадваюць археалагічныя. Аказалася, гэта тое, што з'яўлялася ў свой час нагодай для скаргаў грамадзян, а для камунальнікаў — ледзь не дэтэктыўнага расследавання прычын непаладак. Бо задачы, якія ім даводзілася вырашаць, з разраду нестандартных.

Суразмоўца паказвае каменьгладыш быццам з марскога ўзбярэжжа і ўспамінае звязаную з ім гісторыю.

— Былі праблемы з ацяпленнем у жылым доме № 4 па вуліцы Калініна. Сталі прамываць сістэму, пачулі, як нешта барабаніць у трубах. Што — зразумець не маглі. Ледзь знайшлі прычыну — вось гэты каменьчык. Як толькі работа кацельнай прыпынялася, ён апускаўся на дно, а калі запускалі сістэму, ён з патокам вады падымаўся наверх і закупорваў клапан. Мяркуючы па ідэальнай форме каменя, праблема існавала не адзін год. За гэты час вунь як ён адшліфаваўся. Як толькі дасталі яго, усё пайшло як па масле.

Віктар Івулеў характэрызуе перыяд, калі ў сістэму ЖКГ перадавалі жыллё, кацельныя, цеплавыя і каналізацыйныя сеткі, як адзін з самых цяжкіх. Праблем было мора. Жылфонд зношаны, а патрабаванні да якасці аказання паслуг сталі больш жорсткія. Рухацца прыходзілася адначасова па ўсіх кірунках. У першую чаргу ўвагу ўдзялялі старым цеплакрыніцам, каб была бесперабойная падача цяпла. Падчас работ на адным з такіх аб'ектаў і быў знойдзены чарговы экспанат — тэнісны шарык, які я спачатку прыняла за невялічкае ядро часоў напалеонаўскай вайны.

— Пры будаўніцтве ён нейкім чынам трапіў у трубу, і батарэі ў доме то грэлі, то не грэлі, — расказвае падрабязнасці дырэктар. — Шарык то адкоціцца кудысьці, то зноў праход «падапрэ». Пакуль не разрэзалі трубу і не прамылі сістэму ацяплення дома, не маглі разабрацца, у чым справа. Ад уздзеяння высокай тэмпературы вады шарык так сціснуўся, што стаў падобны на камень.

Шмат падобных знаходак выяўляецца падчас капітальных рамонтаў і рэканструкцый. А апошніх, дзякуючы дзяржаўнай праграме «Камфортнае жыллё», было нямала. У Бялынічах, напрыклад, за грошы, якія выдзяляліся на мадэрнізацыю, штогод рамантавалі пяць-шэсць дамоў (усяго 179). На працягу 10 гадоў мянялі рулонныя дахі, на працяканні якіх скардзіліся людзі, на больш камфортныя шатровыя. На сёння, дзякуючы дзяржпраграме, каля 75 % жыллёвага фонду адрамантавана. І гэта відаць па архітэктурнай выразнасці райцэнтра. Бялынічы зроблены ў стылістыцы камфортнага ўтульнага сонечнага гарадка. Асаблівасць населенага пункта яшчэ і ў тым, што па яго цэнтральных вуліцах, напэўна, праз кожныя сто метраў на слупах уздоўж дарогі размешчаны герб горада — ікона Бяльніцкай Божай Маці. З ёй звязана шматгадовая гісторыя горада, з яе ён і пачынаўся. Насельніцтва, у тым ліку моладзь, добра ведае гэты факт і вельмі ганарыцца ім.

А колькі зроблена работы, не заўважнай воку! Тыя ж цепласеткі, якія сёння на 90 % заменены на сучасную ПІ-трубу. Разам з цепласеткамі праводзілася мадэрнізацыя кацельных, якія сёння ў раёне на 46 % выкарыстоўваюць мясцовыя віды паліва.









Чарговы прадмет з шафы — нейкая хвалепадобная пласціна, як мне падалося, з пластмасы.

— А вось і памыляецеся, — усміхаецца дырэктар прадпрыемства. — Гэта — спрасаваныя солі калію, магнію, марганцу, жалеза і іншых адкладанняў, якія аселі на паверхні цеплаабменнікаў. Калі вада падаграваецца да вышэй чым 50 градусаў, гэта ўсё крышталізуецца. А вось ККД абсталявання падае. Зараз штогод праводзіцца хімпрамыўка цеплаабменнікаў, і такой праблемы не ўзнікае.

Яскравае пацвярджэнне таго, што хімпрамыўка неабходная, сведчыць металічная труха, якая калісьці была канвектыўнай часткай ацяпляльнага катла.

— З-за адсутнасці хімпрамыўкі ўся паверхня катла, які мы абследавалі, была пакрытая солямі, і метал расплавіўся, — расказвае падрабязнасці суразмоўца. — У момант аварыйнага спынення сістэмы сажа загарэлася. Пакуль тушылі, расплавілася канвектыўная частка, метал пераўтварыўся ў парахню. І захацеў бы зрабіць такое спецыяльна, не атрымалася б. А здарыўся тэхнічны момант, і вось вынік.

Віктар Івулеў спадзяецца, што такія экспанаты яму больш у рукі не трапяць. Для паляпшэння якасці пітной вады ў раёне пабудаваны водазабор Міхайлаў. А вось уцечкі, на жаль, здараюцца. Адзін прадмет з калекцыі — каменьчык з заглыбленнем.

— Неяк на прадпрыемстве «Сельгастэхніка» паскардзіліся, што ў іх трубы цякуць, — успамінае той выпадак Віктар Івулеў. — Перакапалі ўсю тэрыторыю, а знайшлі прычыну ў будынку пад падлогай. Труба згніла і вада капала на гэты каменьчык. З часам утварылася ямка. Мяркуючы па яе памерах, цеча існавала гадоў дзесяць.

Не менш цікавая форма атрымалася з шамотнай цэглы.

— У катле з яе была зроблена адбойная задняя сценка, — удакладняе захавальнік калекцыі. — Ад высокай тэмпературы яна стала як слюда. Нават не верыцца, што калісьці гэта было цэглай.

На палічцы ляжыць разбухлы ад вады чаранок рыдлёўкі. А звязаная з ім гісторыя з разраду «наўмысна не прадумаеш».

— Мы яго знайшлі ў ацяпляльнай сістэме дзіцячага садка аграгарадка Вішоў, калі рабілі яе замену, — расказвае дырэктар. — Дыяметр трубы, дзе знаходзіўся гэты чаранок, 57 міліметраў. З часам ён разбух і амаль цалкам заняў усю гэтую прастору. А даўжыня яго болей чым метр. У выніку з ацяпленнем былі праблемы, але знайсці прычыну дапамог толькі капрамонт.

Акрамя прадметаў, дырэктар прадпрыемства захаваў на памяць некалькі не менш цікавых фота. На адным з іх — воданапорная вежа ў ледзяным панцыры.

— Гэта не наш аб'ект, — адразу ж папярэджвае ён. — Знаходзіўся на балансе аднаго з калгасаў. Мы сфатаграфавалі, каб усе бачылі, да чаго прыводзіць безгаспадарчасць. Здымак зроблены прыкладна 10 гадоў таму.

На іншым фота конь па цэнтры горада вязе пакарабачанае аўто на металалом. Дырэктар убачыў гэта фота ў раёнцы і папрасіў падзяліцца. Наступны кадр прывезены з Прыбалтыкі, дзе Івулеў некалі пераймаў вопыт.

— Павезлі нас аднойчы на іхні водаканал і паказалі спілаванае дрэва даўжынёй метраў сем, — дэманструе суразмоўца фота. — Яны яго знайшлі, калі рамантавалі сваю сістэму. Гэта іх стары водаправод. Унутры спецыяльным бурам высвідравана адтуліна. Мяне здзівіла сама тэхніка. Гэта ж трэба было так пастарацца зрабіць адтуліну пасярэдзіне дрэва яшчэ даўжынёй сем метраў!

Віктар Міхайлавіч жартуе, што, калі пойдзе на пенсію, сумаваць не будзе. Цікавага матэрыялу, які ўжо для сённяшняй моладзі — гісторыя, шмат. Застанецца яго сістэматызаваць і стройна выказаць. А пакуль трэба ствараць сённяшнюю гісторыю. Хочацца, каб горад стаў яшчэ больш прыгожым і ўтульным. Асаблівы гонар бяльніцкіх камунальнікаў — азеляненне. У цяпліцах прадпрыемства вырошчваюцца аксамікі, сальвіі, тагетысы, калы — болей чым 10 розных найменняў, усё гэта вясной і летам пікіруецца на клумбы. Штогод у горадзе толькі «Жылкамгас» высаджвае каля 40 тысяч кветак. І гэта без уліку арганізацый і прадпрыемстваў, якія самі для сябе вырошчваюць насенне. Акрамя кветак, у горадзе шмат дэкаратыўных кустоў і дрэў. Асноўныя пароды, якія можна сустрэць на вуліцах, — ліпа, дуб, сасна, елка, бяроза. У горадзе наогул шмат сквераў і паркаў. У тым ліку і звязаных з вядомымі прозвішчамі. У цэнтральным парку прадпрыемства ўстанавіла памятны знак, што там знаходзіўся маёнтак Агінскіх. Парк калісьці быў маёмасцю знакамітага сямейства. Старыя дрэвы прыйшлося спілаваць, бо яны сталі аварыйнымі. А замест іх высадзілі ліпы — іх сёння ў парку каля 70 %. Нездарма ён так і называецца — «Ліпавы гай».

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**

*г. Бялынічы.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**www.zviazda.by**

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 7 чэрвеня 2022 года.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества

# ОАО «Строитель-197», г. Молодечно

| Лот | Наименование Лота | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, BYN | Задаток, BYN | Шаг аукциона, BYN |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль грузовой бортовой MERCEDES-BENZ | 1 176,00 | 117,60 | 58,80 |
| 2 | Станок для гибки арматуры СГА 40А (GW-40 автомат) | 1 296,00 | 129,60 | 64,80 |
| 3 | Мотобур ВТ 360 | 2 520,00 | 252,00 | 126,00 |
| 4 | Нивелир лазерный БОШ линейный | 240,00 | 24,00 | 12,00 |
| 5 | Станок 8Г | 2 880,00 | 288,00 | 144,00 |
| 6 | Станок комбинированный | 552,00 | 55,20 | 27,60 |
| 7 | Станок СМЖ | 840,00 | 84,00 | 42,00 |
| 8 | Станок токарный | 816,00 | 81,60 | 40,80 |
| 9 | Пресс-ножницы | 4 200,00 | 420,00 | 210,00 |
| 10 | Вагон-бытовка строительная | 1 176,00 | 117,60 | 58,80 |
| 11 | Вагон-бытовка строительная | 1 680,00 | 168,00 | 84,00 |
| 12 | Вагон-бытовка строительная | 1 800,00 | 180,00 | 90,00 |
| 13 | Вагон-бытовка строительная | 1 800,00 | 180,00 | 90,00 |
| 14 | Вышка строительная сборно-разборная передвижная ВСРП-2500-20 | 1 080,00 | 108,00 | 54,00 |
| 15 | Компьютеры согласно списку 1: https://docs.google.com/document/d/1JzbpKeJTzQE4Z9CrgAdLod5NMS7Vcahx/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 2 053,87 | 205,39 | 102,69 |
| 16 | Кап. строение (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – одноэтажное кирпичное здание конторы) с инв. № 630/С-39007, общей площадью 335,3 кв. м, с составными частями и принадлежностями (три навеса); система пожарной сигнализации; мебель согласно списку 2: https://docs.google.com/document/d/1JfGDgll07rVeKKkVpMHVTxKuAb91IAXi/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 229 262,24 | 22 926,22 | 11 463,11 |
| 17 | Оборудование согласно списку 3: https://docs.google.com/document/d/1EuWvjcW5KZJsl4iM5STLhFMh1QlXcAww/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 11 226,44 | 1 122,64 | 561,32 |
| 18 | Кап. строение (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – двухэтажное кирпичное здание базы) с инв. № 630/С-38998, общей площадью 870,5 кв. м; мебель, согласно списку 4: https://docs.google.com/document/d/1OuPLBa0AxoC8WSqv1QTePYtLqxJ8zovu/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 323 852,18 | 32 385,22 | 16 192,61 |
| 19 | Леса согласно списку 5: https://docs.google.com/document/d/1iSG4vAz0k2sOJeXe0-m-dfrqv0ut7Zzn/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 3 555,24 | 355,52 | 177,76 |
| 20 | Столы каменщика согласно списку 6: https://docs.google.com/document/d/1uHq2x5x-ZPq_zi6MhDw0uroMSM5E8Pzb/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 3 179,99 | 318,00 | 159,00 |

В отношении Лота № 1 проводятся седьмые повторные торги. **В отношении лота 1 стоимость снижена на 80 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 53 (29675) от 18.03.2022, стр. 23, № 30 (29652) от 15.02.2022, стр. 6, № 13 (29635) от 21.01.2022, стр. 6, № 251 (29620) от 29.12.2021, стр. 15, № 228 (29597) от 25.11.2021, стр. 15, № 205 (29574) от 23.10.2021, стр. 13, № 175 (29544) от 11.09.2021, стр. 6. В отношении Лота № 2 проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 53 (29675) от 18.03.2022. В отношении лотов №№ 3–20 проводятся первые торги

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | По лотам №№ 1–2<br>**20 июня 2022 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25)**<br>По лотам №№ 3–20<br>**11 июля 2022 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25)**<br>по адресу: г. Минск, ул. Мележа, дом 1, офис 1127 |
| **Срок приема заявлений и оплаты задатка** | По лотам №№ 1–2 с 10.00 08.06.2022 до 16.00 17.06.2022<br>По лотам №№ 3–20 с 10.00 08.06.2022 до 16.00 07.07.2022<br>по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Местонахождение имущества** | Минская область, г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 1 |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: Задаток для участия в торгах по Лоту __, ОАО «Строитель-197», г. Молодечно, проводимых __.__.2022.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете «Звязда») на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: по лотам 1–15, 17, 19–20 составляет 7,5 % от конечной цены предмета торгов; по лотам 16, 18 составляет 5 % от конечной цены предмета торгов.** Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 10 (десяти) календарных дней со дня подписания (заключения) договора купли-продажи. В случае совершения просрочки обязательства по заключению договора купли-продажи и его оплате не по вине Покупателя указанные сроки могут быть продлены.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. **По вопросу осмотра объектов обращаться к Александру Владимировичу (+375293697036).** По вопросу наличия обременений обращаться к Артуру, по тел. +375293396845.
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация договора купли-продажи и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет. Государственная регистрация договора купли-продажи транспортных средств и снятие их с государственного учета осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127:**<br>**☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by**<br>**• сайт https://orgtorg.by • telegram: https://t.me/orgtorg** |
| **Продавец** | **ОАО «Строитель-197», г. Молодечно,**<br>**(Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 1)**<br>**в лице ликвидатора ООО «Партнёр-Консультант»,**<br>**тел. +375 (29) 339-68-45 (Артур)** |

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **УП «Комбинат декоративно-прикладного искусства им. А.М. Кищенко»** (УНП 600126458), 222520, г. Борисов, ул. Блюхера, 19, тел. 8 033 688 86 54, в лице ликвидатора ООО «Правовая компания «Делегат».

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **21 июня 2022 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Гараж, инв. № 1-005, общ. пл. 114 кв. м, механические мастерские и склады, инв. № 01-008, общ. пл. 337 кв. м, производственный корпус керамического цеха, инв. № 01-010, общ. пл. 4027,0 кв. м, производственный корпус № 01-003, столовая комбината, инв. № 01-03а, общ. пл. 3000,1 кв. м, проходная, инв. № 01-006 (задняя), проходная центральная, инв. № 01-013, общ. пл. 13 кв. м, склад, инв. № 01-009, склад материальных ценностей, инв. № 01-017, общ. пл. 184 кв. м, склад материальных ценностей, инв. № 01-012, общ. пл. 103,7 кв. м, художественные мастерские, инв. № 01-002, общ. пл. 996 кв. м, г. Борисов, ул. Блюхера, 19 | 1 508 751,65 |
| 2 | Художественные мастерские 610/с-26415, инв. № 01-004, гостиница, инв. № 01-001б – общ. пл. 459,8 кв. м, г. Борисов, пр-т Революции, 42Б | 138 444,49 |
| 3 | Станок гончарный, инв. № 191 | 120,00 |
| 4 | Станок гончарный, инв. № 192 | 120,00 |
| 5 | Станок гончарный, инв. № 192-1 | 120,00 |
| 6 | Станок гончарный, инв. № 192-2 | 120,00 |
| 7 | Станок гончарный, инв. № 192-3 | 120,00 |
| 8 | Промышленная швейная машина Global ZZ 217-3S (Голландия), инв. № 606 | 900,00 |

Телефон для ознакомления и осмотра +37529-698-53-53.

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 09.06.2022 г. 09.00 по 20.06.2022 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену за лот. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 07.05.2022 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

УНП 600012904

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Автобаза» г. Заславль (продавец) проводит открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ СКЛАДА № 4

**(составные части и принадлежности: навес, открытая площадка с ограждением, железобетонный забор), инв. № 600/С-172413 общей площадью 43,0 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623650100001005424 (право аренды по 19.01.2121) площадью 0,7826 га расположенного по адресу: Минский район, г. Заславль, ул. Советская, 122В**.

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: расположен в водоохранной зоне реки Свислочь и на природных территориях, подлежащих специальной охране (в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения артскважин №№ 304, 306-307, 309-324, 524-525 III пояс).*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 636 746,40** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены **– 63 674,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.

Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **11.07.2022** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.07.2022** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11. Тел. для осмотра 8 (029) 565 93 00.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**по продаже не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома, в том числе не завершенного строительством жилого дома, сроки консервации и завершения строительства которого истекли, с одновременной продажей права заключения договора аренды земельного участка**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.

**Лот № 1**. Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом (срок консервации истек) с инвентарным номером № 250/U-43548, наименование – незавершенное законсервированное капитальное строение, назначение – здание неустановленного назначения (фундамент – фундаментные блоки железобетонные сплошные, площадь застройки – 140 кв. м, процент готовности – 12 %) по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, Солоникский с/с, д. Струнье, ул. Витебская, д. 33В, и право заключения договора аренды сроком на 50 лет земельного участка с кадастровым № 223886007101000127 площадью 0,1500 га, находящегося по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, Солоникский с/с, д. Струнье, ул. Витебская, 33В для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения: водоохранная зона водных объектов (р. Западная Двина и р. Струнка).

**Начальная цена предмета аукциона** (в т. ч. не завершенный строительством жилой дом/право заключения договора аренды зем. участка): **4 542,04** (3 360,79/1 181,25) бел. руб. **Задаток:** 454,20 бел. руб. Удельный вес стоимости незавершенного строительством жилого дома в начальной цене предмета аукциона – 73,99 %

**Дата, время и место проведения повторного аукциона: 23.06.2022 в 11.45** по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, пр-т Франциска Скорины, д. 10, малый зал корпуса № 2 Полоцкого райисполкома. **Срок внесения задатка и приема документов: с 8.30 09.06.2022 до 13.00 22.06.2022. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Ранее опубликованное извещение: газета «Рэспубліка» 12.11.2021, информационное сообщение: газета «Полоцкі вестнік» 12.11.2021. Задаток перечисляется на р/с:** BY04 AKBB 3604 0000 0015 5230 0000 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300076105, получатель платежа: Солоникский сельский исполнительный комитет. **Условия для победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона**: в течение 10 раб. дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом и зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и представлением документации, необходимой для его проведения; не позднее двух рабочих дней после совершения вышеуказанных действий и предоставления организатору аукциона и Солоникскому сельскому исполнительному комитету копий платежных документов, заключить с Солоникским сельским исполнительным комитетом договор аренды зем. участка и в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды зем. участка обратиться за гос. регистрацией прав на зем. участок в организацию по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним; в течение шести месяцев со дня гос. регистрации прав на зем. участок получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство объекта и разработать проект на строительство объекта; к строительству жилого дома приступить после согласования в установленном порядке проектной документации; осуществить строительство объекта в сроки, установленные законодательством Республики Беларусь. *Расходы Солоникского сельисполкома по изготовлению и представлению документации составляют 100,12 бел. руб.* **Назначение зем. участка** в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Инженерные коммуникации и сооружения на земельном участке отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией.

**Повторный аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 № 220. Для участия в аукционе приглашаются** граждане РБ, иностранные граждане, лица без гражданства (далее – граждане), индивидуальные предприниматели, юр. лица, консолидированные участники (двое и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юр. лиц). Для участия в аукционе граждане, инд. предприниматели, консолидированные участники и юр. лица (лично либо через своего представителя) в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, с отметкой банка, заключают соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, удостоверяющего личность без нотариального засвидетельствования; инд. предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации инд. предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или инд. предпринимателя – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства; представителем или уполномоченным должностным лицом юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юр. лица – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления об участии в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на бел. или русск. язык, доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на бел. и русск. язык. Документы, составленные за пределами РБ в соответствии с законодательством иностр. государства, должны быть легализованы, если иное не предусмотрено законодательством. Консолидированными участниками представляются оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников в отношении предмета аукциона. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения, перечисляются на р/с, указанный в протоколе аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с документацией, а также возможность осмотра на местности предмета аукциона. **Конт. тел. (044) 7095552 (029) 5100763.**

**ЗАО «БелБанкротАукцион»**, организатор торгов по продаже имущества **ГОУП «Лечебно-производственные (трудовые) мастерские»** (УНП 500055202), объявляет о проведении **20.06.2022 г.** в 09.00 публичных торгов в электронной форме. Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

УНП 193417684

# «МАГЧЫМАСЦІ БРЭСЦКАЙ КРЭПАСЦІ Ў СПРАВЕ ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ НЕАБМЕЖАВАНЫЯ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Што вам даў вопыт работы ў вышэйшым заканадаўчым органе краіны?***

— Вельмі многае. Удзел у заканатворчым працэсе заўсёды спрыяе пашырэнню кругагляду, выпрацоўвае дзяржаўнае мысленне. Даводзілася рыхтаваць некалькі дзясяткаў паведамленняў па канкрэтных заканадаўчых актах. А яшчэ гэта магчымасць знаёмства з цікавымі людзьмі і магчымасць знайсці аднадумцаў у сваёй справе. Тыя напрацоўкі, сувязі, скажам, з расійскімі музеямі выкарыстоўваем у рабоце і цяпер. Стасункі з саюзнымі парламентарыямі спрыяюць прыняццю і рэалізацыі праграм па далейшым развіцці мемарыяльнага комплексу. Заўсёды ўзбагачаюць сустрэчы з дзяржаўнымі дзеячамі, інтэлектуаламі ад эканомікі і, што мне асабліва цікава, ад культуры.

***— Дарэчы, як вы прыйшлі ў культуру? Гэта быў свядомы выбар ці збег абставін?***

— І тое, і другое. Цяпер думаю, што ёсць, несумненна, пэўны элемент выпадковасці, але болей усё ж заканамернасці. Я нарадзіўся ў невялікай вёсцы Нэплі, што пад Брэстам. Там пайшоў у першы клас, а потым нашу школу закрылі, дзеці пачалі хадзіць у Клейнікі, за шэсць кіламетраў па бездарожжы: тады ж не было школьных аўтобусаў. І людзі пацягнуліся бліжэй да горада. Вось і мае бацькі пабудавалі хату ў прыгарадзе, мы сталі жыць у цяперашнім мікрараёне Рэчыца. Я пайшоў вучыцца ў гарадскую школу. З часам стаў наведваць рэпетыцыі ансамбля танца «Прыбужжа», які да канца маёй вучобы ў школе атрымаў званне народнага, потым танцаваў у нашай знакамітай «Радасці». Так што з культурнай галіной пэўным чынам звязана ўсё жыццё.

Адукацыю атрымаў у Брэсцкім дзяржаўным педагагічным інстытуце — ён так тады называўся — на філалагічным факультэце. Затым была служба ў войску, работа ў камсамольскіх, партыйных органах. У пачатку 1990-х гадоў прыйшоў на працу ў Брэсцкі гарвыканкам намеснікам старшыні, курыраваў сацыяльныя пытанні, у тым ліку і культуру. А ў 1996 годзе ўзначаліў упраўленне культуры аблвыканкама і працаваў тут 12 гадоў.

***— У гэты час актыўна закрывалі многія сацыяльныя аб'екты ў сельскай мясцовасці, асабліва ўстановы культуры...***

— Так, людзей на вёсцы станавілася менш, наступова сталі закрываць магазіны, школы, клубы, бібліятэкі. З гэтым працэсам, як я ўжо казаў, мая сям'я сутыкнулася ў 1960-я гады. І працэс увесь час працягваўся. Урбанізацыя цягне за сабой згасанне невялікіх сельскіх населеных пунктаў. Але адна справа, калі ты пасіўны назіральнік гэтых з'яў, іншая — калі табе трэба ехаць на сход, тлумачыць прычыны такога кроку, знаходзіць працу людзям, якія застаюцца пасля закрыцця аб'екта. Важна было не проста закрыць тую ці іншую ўстанову, але, як цяпер кажуць, аптымізаваць яе. Дзе можна было, стараліся аб'яднаць клуб з бібліятэкай у адно. Тады ж з'явіліся першыя так званыя дамы сацыяльных паслуг. Пачалі ўкараняць новую форму абслугоўвання — бібліятэчныя, клубныя аўтамабілі, якія, дарэчы, запатрабаваныя і карыстаюцца папулярнасцю ў насельніцтва.



Фота БелТА.

***— І ўсё роўна, калі закрываюць школу, клуб, краму, жыццё з вёскі пачынае паволі сыходзіць. Вы згодны з такім сцвярджэннем?***

— Цалкам згодны. І таму вось гэтую з'яву пад назвай аграгарадкі, іншымі словамі дзяржаўную праграму па развіцці вёскі, лічу вельмі правільнай і своечасовай. Прынятыя на дзяржаўным узроўні сацыяльныя стандарты дазволілі захаваць у буйных населеных пунктах дамы культуры, бібліятэкі, адрамантаваць, мадэрнізаваць будынкі, напоўніць новым абсталяваннем і зместам. Успамінаю, як даводзілася літаральна прабіваць камп'ютарызацыю сельскіх бібліятэк. Некаторым кіраўнікам раённай прыйшлося даволі настойліва даказваць неабходнасць гэтых фінансавых выдаткаў, бо ў бібліятэцы мусіць быць камп'ютар, нават калі яна невялікая і сельская.

Тое ж і з клубамі. Яны не толькі месцы правядзення мерапрыемстваў, свят — гэта найперш месца сустрэчы творчых людзей, самадзейных артыстаў. Вы не ўяўляеце, колькі ў нас апантаных песняй, танцам, хто былі гатовы ехаць на конкурс, фестываль, паказваць сваё мастацтва толькі таму, што любяць гэтую справу. І як гэтых людзей можна не падтрымаць?! Вось згадваю народны ансамбль з вёскі Тэльмы. Нехта працуе на цяплічным камбінаце, нехта — у суседняй гаспадарцы, іншы кожны дзень едзе на працу ў горад, але кожны вечар спяшаецца на рэпетыцыю. А ў глыбінцы, аддаленых вёсках такіх калектываў у маю бытнасць налічвалася вялікае мноства. Самадзейныя артысты зрываліся і ехалі на любое мерапрыемства па першым закліку. Пры тым, што дома чакала сям'я, часам даволі вялікая падсобная гаспадарка, якую пакідалі на мужа альбо жонку, часам нават на суседзяў. Песня, музыка, народны танец іх так аб'ядналі, што па-іншаму яны ўжо жыць не могуць, гэта стала часткай іх душы.

Цяпер ужо не так часта бываю на розных фестывалях альбо аглядах самадзейных калектываў, але калі бываю, то радуюся, што многія з іх жывуць, папаўняюцца новымі сіламі з ліку маладзейшых артыстаў. Не так даўно на юбілеі «Радасці» бачыў такія калектывы: дзіцячыя, маладзёжныя, дарослыя. Яны ўсяляюць аптымізм за будучыню самадзейнага мастацтва.

***— У 90-я гады ў Брэсце пачыналіся знакавыя фестывалі, конкурсы. Прапаную ўспомніць той час.***

— Разам з нашымі дырэктарамі тэатраў Аляксандрам Козакам і Міхаілам Шавелем мы пачыналі арганізацыю міжнароднага тэатральнага фестывалю «Белая вежа». Фэст у верасні станавіўся сапраўдным святам тэатральнага мастацтва, да нас ехалі прафесійныя трупы з многіх краін свету. Новым зместам быў напоўнены тады міжнародны фестываль «Студзеньскія музычныя вечары», які ўзнік у 1980-х гадах. Да гэтага кіраўнік музычнага таварыства Лілія Батырава ў яго арганізацыі абапіралася толькі на свае намаганні, у 1990-х фэст атрымаў дзяржаўную падтрымку.

Мы сталі падтрымліваць творчых людзей. Згадваю конкурс «Берасцейская зорка», калі адзначалі дзеячаў культуры па розных намінацыях. Пачаліся фестывалі духавой музыкі, якія цяпер паспяхова працягваюцца. У раёнах сталі з'яўляцца свае творчыя фестывалі і святы. Атрымлівалі вядомасць актыўнасці ў раёнах, той жа Мотальскі музей альбо школа бондарства ў Іванаве — стараліся падтрымаць народных майстроў, энтузіястаў музейнай справы. Зараз я пералічваю многія кірункі літаральна штрыхамі, а за кожным такім мерапрыемствам, кожнай кампаніяй, справай стаялі месяцы, часам гады напружанай працы, высілкі многіх і многіх людзей.

***— Другая палова 1990-х — час работы над знакавымі аб'ектамі па аднаўленні гісторыка-культурнай спадчыны. У свой час кожны з іх быў уключаны ў дзяржаўную праграму і атрымаў адпаведнае фінансаванне, але ж гэтаму папярэднічала вялікая ці, лепей сказаць, аграмадная арганізацыйная работа, шмат папер, узгадненняў. Што асабліва запомнілася?***

— У тую пару спецыялістам па пытаннях захавання гісторыка-культурнай спадчыны ў нас працаваў Леанід Несцярчук. Многія яго ідэі былі падтрыманы і рэалізаваны. А запомніліся гады работы найперш вынікамі, калі адкрываліся гэтыя аб'екты для наведвальнікаў, калі заканчвалася першая чарга якой-небудзь работы, гэта значыць, першы крок здзейснены. І зараз прыемна заязджаць, скажам, у Ружанскі палац, які прымае мноства турыстаў, мае добры музей. А галоўнае — работа там працягваецца. З часам Ружанскі палацавы комплекс абяцае стаць асаблівай турыстычнай жамчужынай. Скажам, у Косаве нейкія дваццаць гадоў таму наогул нічога не было, адны руіны. Зараз маем сядзібу-музей Тадэвуша Касцюшкі, а праз дарогу — велічны Косаўскі палац. Адрадзіўся і палац Нямцэвічаў пад Брэстам, з'явілася шмат знакавых мясцін у раёнах вобласці. Трэба аддаць належнае таму пакаленню работнікаў культуры, у тым ліку і нашай камандзе, з якой давялося працаваць. Сёння маем што паказаць дзецям, гасцям Брэстчыны. Да нас едуць турысты.

***— Як і ў Брэсцкую крэпасць, сярод наведвальнікаў якой — дзясяткі мільёнаў. Ці лічыце вы цяперашнюю работу вяршыняй сваёй кар'еры?***

— Несумненна. Цяпер відавочна, што гэта самыя цікавыя гады маёй працы, напоўненыя сустрэчамі, адкрыццямі, дасягненнямі. У ліку апошняга можна згадаць стварэнне новых экспазіцый, адкрыццё новых музеяў, рэканструкцыю мемарыяльнага комплексу. І яшчэ — усведамленне знакавасці, асаблівасці гэтага аб'екта напаўняе гонарам, адказнасцю. Адным словам, я палюбіў усё гэта адразу, як толькі прыйшоў. Тут працуе цудоўны калектыў прафесіяналаў, якім можна ганарыцца, які годна працягвае традыцыі папярэднікаў. Нядаўна мемарыяльны комплекс быў узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны. У нас мняла адзнак на дзяржаўным узроўні, але ж галоўнае — гэта водгукі людзей, цікавасць да крэпасці. Як я нядаўна сказаў на сустрэчы з моладдзю, не зарастае народная сцяжына ў крэпасць.

***— Пасля перапынку, звязанага з пандэміяй, паток турыстаў аднавіўся?***

— За тры першыя тыдні мая ў нас было 160 тысяч наведвальнікаў. Такая колькасць звязана найперш са святочным днём 9 Мая. Як вядома, былі дні бясплатнага наведвання музеяў па ўсёй краіне. Зранку мы назіралі — ці паверыце? — вялікую плыню людзей. Такое павярхоўнае знаёмства, з аднаго боку, не лепшым чынам спрыяе засваенню інфармацыі. Чалавек праходзіць па экспазіцыі: паглядзеў направа, паглядзеў налева, пайшоў далей. А з іншага боку — хоць так. Яго нешта зачапіла, зацікавіла, ён прыйдзе зноў, каб паглядзець больш удумліва. Прыйдзе з сям'ёй ці сябрамі, няхай сабе нават у адзін з музеяў. Дарэчы, ведаеце, якую асаблівасць заўважыў у асяродку турыстаў? Усе хочуць пачынаць агляд з Музея абароны. Бывае, калі патокі турыстаў вялікія, каб развесці іх, асобным групам прапануем пачынаць агляд з новых музеяў, якія побач. А яны не пагаджаюцца, кажуць, што хочуць з гэтага.

***— Нядзіўна, Музей абароны працуе з 1956 года, ён ёсць ва ўсіх зборніках, буклетах, менавіта тут знаходзіцца знакаміты гадзіннік, які паказвае 4 гадзіны раніцы, час нападзення на крэпасць 22 чэрвеня... І, хоць апошнім часам у сваёй газеце мы не раз расказвалі пра новыя музейныя экспазіцыі, думаю, варта нагадаць пра іх зноў, бо яны знамянуюць сабой чарговы этап развіцця мемарыяльнага комплексу.***

— Так, найстарэйшы наш музей асаблівы, можна сказаць, што гэта намоленае месца. З яго пачынаўся мемарыяльны комплекс. Гэты музей стаў цэнтрам камунікацый з абаронцамі крэпасці, іх сустрэч тут, што сёння самае каштоўнае ў нашай рабоце. Ён уяўляе сабой класічны музей.

З 2015 года ў нас з'явіліся такія экспазіцыі, як «Музей вайны — тэрыторыя міру», «Летапіс Брэсцкай крэпасці». Апошнюю можна назваць унікальнай, аналагаў якой няма ў Беларусі. Яшчэ адна экспазіцыя расказвае пра абарону Усходняга форта. Рэканструяваны Пяты форт стаў асобным музеем. Пачынаючы з 2018 года дзевяць аб'ектаў было адрамантавана, тры музейныя экспазіцыі адкрыты ў рамках рэалізацыі праекта Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Работа ўвесь час працягваецца. Ёсць задумкі, праекты, планы на далейшае развіццё крэпасці менавіта пры садзейнічанні Саюзнай дзяржавы. Гэта наш абавязак перад будучымі пакаленнямі — захаваць крэпасць як сімвал мужнасці і стойкасці яе абаронцаў. Ну а для гэтага трэба падтрымліваць у стане, прывабным для наведвальнікаў. Таму наперадзе — вялікая работа, якой хопіць і новым пакаленням супрацоўнікаў мемарыяла.

***— Крэпасць для кожнага брастаўчаніна, можа, нават для жыхара нашай краіны — аб'ект асаблівы. Мемарыял не абыходзіць ніводная дэлегацыя, тут ледзь не кожны дзень ладзяцца мерапрыемствы. Што лічыце цяпер самым важным у рабоце, што радуе ці выклікае заклапочанасць?***

— Тое, што нас не мінае ніводная дэлегацыя, гэта абсалютна дакладна. І форум камунальнікаў, і сімпозіум дактароў, як правіла, пачынаюцца з ускладання кветак да Вечнага агню, не кажучы ўжо пра ўрадавыя ці парламенцкія дэлегацыі. Пісьменнікі, дзяржаўныя дзеячы, палітыкі часта ў розных кантэкстах згадваюць подзвіг гарнізона крэпасці як узор мужнасці і вернасці Радзіме. І гэта цудоўна. У нас прымаюць прысягу воіны, прысвячаюць у студэнты, праводзяць выпускнікоў асобных устаноў. Нядаўна бачыў, як прымалі ў піянеры вучняў школ з Пінскага і Івацэвіцкага раёнаў. Некаторыя школы гэтых раёнаў зрабілі традыцыяй прывозіць дзяцей у крэпасць, каб завязаць гальштукі тут. Падобных традыцый павінна ставіцца больш. Асабліва цяпер мы па-новаму пачынаем усведамляць, як гэта важна для патрыятычнага выхавання маладога пакалення. А патэнцыял для такога выхавання ў Брэсцкай крэпасці неабмежаваны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Нашы парады

# ЛЕТА — НАЙЛЕПШЫ ЧАС КІНУЦЬ КУРЫЦЬ

## Але як гэта зрабіць?




**З пункту гледжання навуковых падыходаў пачатак лета з'яўляецца найлепшым часам гада, каб кінуць курыць. Паводле даных, каля 20 % беларусаў задумваюцца аб адмове ад курэння і гатовы нешта рабіць, астатнія або ў стане нявызначанасці, або ўвогуле не ўсведамляюць такой неабходнасці (каля 40 % курцоў).**

— Тытунь — гэта камерцыйны прадукт, ад прымянення якога гіне каля паловы яго пастаянных карыстальнікаў. Пры гэтым, каб кінуць курыць, патрэбны станоўчыя стымулы і матывацыя, а не сорам ці страх і абвінавачванні з боку навакольных, — кажа **каардынатар праграм Сусветнай арганізацыі аховы здароўя па грамадскім здароўі Валянцін РУСОВІЧ.**

Вядома, што, калі чалавек кідае курыць у маладым і сярэднім узросце, ён амаль адразу зніжае рызыку сардэчна-сасудзістых хвароб. Таксама змяншаецца рызыка у адносінах да 27 відаў раку да ўзроўню тых, хто зусім не курыць. Акрамя таго, зніжаецца імавернасць захварэць на хранічную абструктыўную хваробу лёгкіх. Пры гэтым чалавек, які кінуў курыць, нясе карысць навакольнаму асяроддзю.

— Увесь жыццёвы цыкл цыгарэты патрабуе 3,7 літра вады. Сярэдні курыльшчык можа сэканоміць да 74 літраў вады ў дзень, калі кіне курыць. Штогод каля 4,7 трыльёна акуркаў выкідваецца ў навакольнае асяроддзе, выдзяляючы больш за 7 тысяч хімічных рэчываў, 70 з якіх з'яўляюцца вядомымі канцэрагенамі, якія забруджваюць тратуары, паркі, у рэшце рэшт, вадаёмы і атручваюць у тым ліку і марское жыццё, — прыводзіць лічбы Валянцін Русовіч.

Па спыненні распаўсюджанасці курэння ў Беларусі ёсць хоць і марудны, але адчувальны прагрэс. Паводле апошняга даследавання Steps, якое будзе апублікавана ў хуткім часе, распаўсюджанасць курэння сярод мужчын знізілася больш чым на 5 %. Сёння ў Беларусі кураць 42 % мужчын і 11 % жанчын. У лічбах гэта больш за 2 мільёны чалавек.

Пры гэтым курэнне сярод моладзі таксама становіцца менш папулярным. Даследаванне 2021 года па ўжыванні тытуню сярод моладзі сведчыць пра тое, што сярод 13—15-гадовых хлопчыкаў узровень курэння з 2004 года знізіўся амаль у 10 разоў — з 31 % да 4 %. Курэнне сярод дзяўчат за апошнія 18 гадоў таксама кардынальна знізілася — з 21 % да 3 %.

— Разам з тым выклікае занепакоенасць выкарыстанне моладдзю электронных цыгарэт. На пытанне «Ці выкарыстоўвалі вы электронныя цыгарэты за апошнія 30 дзён?» 15 % хлопчыкаў і 14 % дзяўчынак адказалі станоўча. Больш за 40 % падлеткаў 13—15 гадоў, якія ўжываюць тытунь, нягледзячы на ўзрост, маглі свабодна купіць яго ў магазінах і кіёсках, — кажа Валянцін Русовіч.

Пры гэтым суразмоўнік дадае, што электронныя цыгарэты не з'яўляюцца інструментам для спынення курэння, бо яны яго імітуюць. З іншага боку, СААЗ рэкамендуе ўсім краінам зарэгістраваць і забяспечыць доступ для нікацінзамяшчальнай тэрапіі. Гэта лекавы сродак у выглядзе пластыра, жавальных гумак, спрэяў. Яны дапамагаюць людзям, якія маюць нікацінавую залежнасць і выкурваюць паўпачка цыгарэт у дзень і больш.

Сярод дзейсных мер, якія прымушаюць не пачынаць курыць, а тых, хто курыць, кінуць, — павышэнне акцызаў на тытунь. Цяпер акцыз складае 35 %, а па рэкамендацыях СААЗ ён мусіць быць павялічаны да 70 %. Побач з гэтым прапануюцца іншыя нікацінзамяшчальныя меры — пластыры і жавальныя гумкі. Яшчэ адна важная мера, якая была ўведзена ў Беларусі ў 2019 годзе, — поўная забарона курэння ў закрытых памяшканнях. За 40 гадоў гэта дазваляе знізіць распаўсюджанасць курэння на 11 %. Папераджальныя надпісы на пачках цыгарэт дазваляюць зменшыць колькасць курцоў на 5—7 %.

— Асноўныя прынцыпы спынення курэння даволі простыя: лепш за ўсё кідаць курыць адразу і назаўсёды і выбраць пэўны дзень на працягу найбліжэйшага месяца. Да гэтага два тыдні трэба рыхтавацца. Наступны крок — аб'явіць пра сваё рашэнне калегам на рабоце і дома. Да гэтага часу варта выкінуць усё, што нагадвае пра курэнне: попельніцы, цыгарэты і інш. Акрамя таго, пажадана паспрачацца на даволі вялікую суму, што вы кінеце курыць. Калі чалавек выкурвае больш за паўпачка цыгарэт, то яму, верагодна, давядзецца падрыхтавацца і прымяніць нікацінзамяшчальную тэрапію, — раіць Валянцін Русовіч.

— Мы гатовы працаваць на любым этапе, нават тады, калі вам здаецца, што вы шмат разоў кідалі і нічога не атрымаецца. Гэта комплексны падыход — фармакатэрапія, што значыць лячэнне прэпаратамі, псіхатэрапія і неабходнае кансультаванне і падтрымка, у тым ліку з дапамогай дадаткаў. Усё разам дапамагае цалкам адмовіцца ад курэння і ніколі да яго не вяртацца, — дадае **галоўны ўрач Мінскага абласнога клінічнага цэнтра «Псіхіятрыя-наркалогія» Аляксей АЛЯКСАНДРАЎ.**

Скажыце, доктар!..

# ЛІНІЯ АБАРОНЫ АД СТРЭСАЎ

## Як правільна спраўляцца з крызісам?

**Псіхатэрапеўты лічаць, што крызіс — гэта не тупік, а некаторыя супярэчнасці, праз якія праходзіць чалавек на шляху свайго сталення. У кітайцаў слова «крызіс» складаецца з дзвюх піктаграм, адна з якіх адлюстроўвае магчымасць, а другая — небяспеку. Дык што такое крызіс у жыцці чалавека і якія яго прычыны? Як пазбегнуць разбуральных наступстваў і дапамагчы сабе выйсці на новы ўзровень развіцця? Якія фактары і псіхалагічныя асаблівасці нас абароняць? Пра гэта мы пагаварылі з Інай КУРЫЛАЙ, псіхолагам Гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера.**

— Сутыкненне чалавека з цяжкай перашкодай — стратай блізкага, працы, здароўя, разводам — спараджае крызіс. Працэс яго пераадолення — гэта ўнутраная работа па аднаўленні душэўнай раўнавагі, напаўненне новым сэнсам чалавечай дзейнасці. Любы крызіс прадугледжвае два выхады: альбо чалавек можа аднавіць перапыненае крызісам жыццё, адрадзіць яго, альбо жыццё перараджаецца, і чалавек становіцца зусім іншы, і ў гэтым іншым жыцці ён ставіць перад сабой іншыя мэты і шукае новыя спосабы іх дасягнення. У дадзеным выпадку крызіс выводзіць чалавека на новы ўзровень асобаснага развіцця.

***— Што мы адчуваем у гэты перыяд?***

— Падчас крызісу мяняецца эмацыянальны фон. Мы можам адчуваць адно з трох дамінантных пачуццяў: дэпрэсію, дэструктыўнае пачуццё або адзіноту. Дэпрэсіўная рэакцыя выяўляецца ў такіх пачуццях, як апатыя, абыякавасць, расчараванне, стомленасць, нуда, прыгнечанасць.

Да дэструктыўных пачуццяў адносяцца раздражняльнасць, злосць, крыўда, агрэсія, нянавісць, прыкрасць, упартасць, прыдзірлівасць, недаверлівасць, зайздрасць. Адзінота выяўляецца ў такіх перажываннях, як пачуццё непатрэбнасці, неразуменне, тупік, безнадзейнасць, пустэча.

У чалавека змяняецца аб'ём зносін: ён альбо рэзка іх абмяжоўвае (сыход у сябе), альбо рэзка павялічвае (адзінота ў натоўпе). Чалавек як бы шукае забыцця ў шматлікіх павярхоўных кантактах з іншымі людзьмі.

***— Мужчыны і жанчыны аднолькава перажываюць крызіс?***

— Ёсць схемы перажывання крызісу, больш характэрныя для жанчын і для мужчын. Стэрэатыпы фемініннасці дазваляюць жанчыне паказваць сябе слабай, дзяліцца праблемамі, прасіць дапамогі ў іх вырашэнні. Падобныя ж паводзіны ў мужчыны не ўхваляюцца грамадствам. Таму ў іх крызіс больш звязаны з унутранымі перажываннямі. Стэрэатып маскуліннасці прадугледжвае здольнасць самастойна спраўляцца з сітуацыяй, незалежнасць у прыняцці рашэнняў. Такім чынам, мужчына вымушаны здзяйсняць унутраную нябачную працу над крызіснай сітуацыяй. Таму ў мужчын вонкавая адсутнасць прыкмет крызісу не азначае яго сапраўднай адсутнасці. У гэты ж час напружанне ўнутры чалавека няўхільна назапашваецца і можа праявіцца ў тым ліку аўтаагрэсіўна, суіцыдальна.

***— Як заўважыць надыходзячы крызіс?***

— Ёсць некалькі прыкмет. Гэта наяўнасць праблемы, якая стварае дыскамфорт, што распаўсюджваецца на многія сферы жыцця. Напрыклад, напружаныя адносіны на працы працягваюць «круціцца» ў галаве дома, на адпачынку, пры сустрэчы з сябрамі. Псіхічны стан пачынае ўплываць на фізіялогію.

Змяняюцца ў горшы бок адносіны з навакольнымі і блізкімі. Пачынае раздражняць тое, на што раней зусім не звярталі ўвагі. Узнікае адчуванне, што нас не разумеюць і на злосць нам нешта робяць. Падае ецца, што нейкая наша асаблівасць, стыль зносін, рэакцыя на заўвагі, успрыманне крытыкі перашкаджаюць прасоўванню наперад.



***— Чаму ўзнікаюць крытычныя сітуацыі? Ці ўсе схільныя пры вялікіх непрыемнасцях адчуваць крытычны стан?***

— Прычыны разнастайныя. З аднаго боку, на іх уплываюць сацыяльныя і сітуацыйныя фактары, з другога боку — індывідуальныя і біялагічныя асаблівасці чалавека.

Схільнасць да крызісных станаў асабліва вялікая ў дзяцей, падлеткаў і асоб старэйшага ўзросту. Да групы рызыкі па развіцці крызісных станаў таксама адносяцца людзі з фізічным знясіленнем, якія маюць псіхатраўму ці перажылі цяжкую страту. Вялікае значэнне для ўзнікнення крызісных сітуацый маюць характар і інтэнсіўнасць стрэсавай сітуацыі. Жыццёвыя крызісы падобныя да матрошкі: некаторыя людзі іх перажываюць, а іншыя назапашваюць адзін за адным.

Выйсце з крызісу часам параўноўваюць з рашэннем складанага матэматычнага ўраўнення, запіс якога займае цэлую старонку і якое трэба спрасціць. У выніку правільных дзеянняў мы атрымліваем простую роўнасць, няправільныя ж дзеянні прыводзяць да ўскладнення і заблытвання выхаднага матэрыялу. Скарачаючы лішняе, мы пакідаем сутнасць. Як толькі ўсё атрымліваецца, мы можам сказаць, што выйшлі з крызісу. Чалавек, які перажыў крызіс, заўсёды становіцца мацнейшы, бо з'яўляецца новы вопыт. Як кажуць у народзе, «за аднаго бітага двух нябітых даюць». Змяненне знешняга свету даецца нам складаней. Мы можам змяняць сябе, хоць для некаторых людзей гэта больш складана, чым змяняць знешнія абставіны.

***— Што можна параіць, калі чалавек перажывае балючы адрэзак жыцця?***

— «Боль» і «пакута» — не адно і тое ж, іх можна падзяліць. Боль — гэта непазбежная эмацыянальная рэакцыя на вострыя крызісныя падзеі. Яго можна толькі пражыць: пачуццё здрады, зман, гнеў, расчараванне, адчуванне сваёй бездапаможнасці.

Пакута — гэта выбар замест узмоцненага клопату пра сябе ў момант крызісу займацца самаедствам і самаразбурэннем. Напрыклад, ганяць у галаве самапрыніжальныя думкі, самаабвінавачванні. Гэта падтрымліваць здранцвенне з дапамогай «запояў» усіх выглядаў (серыялы, алкаголь, ежа — што заўгодна, але не для задавальнення, а каб падтрымліваць здранцвенне з прычыны нейкіх сваіх перажыванняў).

Таму ў момант крызісу карысны будзе спіс стандартных пытанняў аб тым, наколькі добра ты клапоцішся пра сябе: «Колькі гадзін ты сёння спаў?», «Якая была якасць сну?», «Колькі разоў еў і што?», «Ці дастаткова п'еш вады?», «Ці хадзіў на прагулку?»

Калі адказ на пытанні, ці ўжываўся алкаголь і іншыя сродкі для здранцвення, станоўчы — не караць сябе за гэта, а прааналізаваць, як гэта ўсё пагаршае твой і так не самы лепшы стан. Таму што адмова бачыць рэальнасць яшчэ нікому не дапамагала нічога вырашыць, із-за фізічнага недамагання здольнасць нешта зрабіць з рэальнасцю, якая цябе ў дадзены момант ірве на часткі, яшчэ і зніжаецца, што заганяе ў зыходны ступар.

Таму selfcare — менавіта ў плане клопату аб сваім чыста фізічным дабрабыце — і ёсць першая лінія адказу на стрэсавыя падзеі. У фінале спіса абавязкова ідзе пытанне «Што ты рабіў, каб падтрымаць сябе?» Напрыклад, размаўляў з блізкімі, якія падтрымліваюць, рабіў нешта ў доме, што радуе, гуляў з катом, катаўся на веласіпедзе ці займаўся медытацыяй.

Я заўсёды прапаную сваім кліентам скласці спіс, што можна рабіць, каб падтрымаць, насыціць сябе дастатковай колькасцю сіл, каб спраўляцца з крызісам, — у якасці хатняга задання. І калі накрывае з галавой, не думаць, а зазірнуць у яго і зрабіць найлепшае на дадзены момант.

У псіхааналізе ёсць паняцце «інвестыцыі». Інвестуйце ў сябе, гэта значыць, укладвайце сваю псіхічную энергію. Выяўляецца гэта часта ў дачыненні да звычайных хатніх спраў, захапленняў, заняткаў спортам, працы. Гэта час, грошы, якаснае харчаванне, эмоцыі.

Для адаптацыі ў крызісе паспрабуйце складаць кароткатэрміновы план на дзень, тыдзень, найбліжэйшы час і прытрымлівацца яго. Ніхто не ведае, што будзе далей і ці спрацуе ваш план, але працягваць рабіць маленькія крокі і выконваць прапісаныя задачы — значыць інвеставаць у сваю магчымасць хоць нечым кіраваць. Гэта аўтаматычна анулюе пачуццё бездапаможнасці і дасць тое, што зараз так неабходна, — пачуццё апоры. І, несумненна, рана ці позна ўсё вернецца на кругі свае!

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Криница», г. Минск, ул. Радиальная, 52** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов: транспортные средства с пробегом. Месторасположение: г. Минск, ул. Радиальная, 52**

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС, снижена на 30 % |
|---|---|---|
| 1 | **Легковой седан Вольво S80**, рег. знак 9258 BI-7, 2002 г. в., инв. № 11736 | 5 460,00 бел. руб. |
| 2 | **Грузовой фургон изотермический ГАЗ 3302**, рег. знак АЕ 7531-7, 2008 г. в., инв. № 14559 | 3 192,00 бел. руб. |

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов **www.cpo.by**. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, штрафные санкции прописаны в соглашении о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **10 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 18.05.2022

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 20.06.2022 с 11.00 до 13.00.**
